ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ! Аўторак, 30 лістапада 1937 г. № 64 (335) Цана 20 кап.

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

Орган праўлення ССПБ і Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР

Кандыдаты беларускага народа

З вялікім уздымам прайшоў першы этап выбарчай кампаніі—сумеснае вылучэнне комуністамі і беспартыйнымі—усім совецкім народам кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета. Вылучаныя кандыдаты зарэгістраваны для балатыравання камісіямі выбарчых акруг. На аснове Сталінскай Канстытуцыі пераможнага соцыялізма былі абмеркаваны і вылучаны кандыдаты Совецкі народ праявіў высокую палітычную свядомасць і арганізаванасць, паказаў, якія моцныя ніці звязваюць яго з партыяй Леніна—Сталіна, і з сапраўды гаспадарскай клапатлівасцю падышоў да таго, каго паслаць у вышэйшы орган улады соцыялістычнай дзяржавы рабочых і сялян. Кандыдатамі ў дэпутаты Вярхоўнага Совета вылучаны лепшыя партыйныя і непартыйныя большэвікі, верныя справе Маркса—Энгельса—Леніна—Сталіна, адданейшыя патрыёты совецкай радзімы.

Увесь народ Совецкай Беларусі на тысячах сходаў назваў тварца нашага шчасця, вялікага правадыра працоўных таварыша Сталіна і саратнікаў яго—кіраўнікоў партыі і совецкага ўрада—першымі кандыдатамі ў дэпутаты Вярхоўнага Совета. І вялікая радасць галасаваць у дзень выбараў за кандыдатуру лепшага друга і саратніка вялікага Сталіна першага маршала Совецкага Саюза Клімента Ефрэмавіча Варашылава выпала выбаршчыкам сталіцы БССР—Менска.

Імем любімага наркома, маршала Совецкага Саюза адкрываецца спіс кандыдатаў беларускага народа. Вылучаныя кандыдаты—гэта лепшыя сыны і дочкі нашай соцыялістычнай радзімы, стаханаўцы прамысловасці і калгаснай вёскі, даказаўшыя сваёй працай адданасць справе соцыялізма.

Вось кандыдат у Совет Саюза Іван Сямёнавіч Каровін. Рабочы-мадэльшчык з 30-гадовым стажам, стаханавец, член партыі. Яму, прайшоўшаму суровую жыццёвую школу, адданаму сыну рабочага класа, працоўныя Бабруйска аказалі высокае давер'е быць кандыдатам. Знатны калгаснік, непартыйны большэвік, загадчык коннатаварнай фермы ордэнаносец Нікіта Ермалаевіч Батоўкін—лепшы прадстаўнік калгаснага сялянства—балатыруецца ў Совет Саюза па Клімавіцкай выбарчай акрузе. Майстар цэха, стаханаўка запалкавай фабрыкі Екацярына Журанкова і выдатны трактарыст Сяргей Макарэнка, комсамолкі-стаханаўкі Ніна Лісунова, лепшая мотальшчыца шаўковай фабрыкі, і Елена Белая, ордэнаноска, брыгадзір свінафермы соўгаса—прадстаўнікі маладога пакалення, узрошчанага совецкай краінай, аднадушна вылучаныя рабочымі і работніцамі, калгаснікамі і калгасніцамі, будуць балатыравацца ў дэпутаты Вярхоўнага Совета.

У ліку кандыдатаў—лепшыя прадстаўнікі горача любімай совецкім народам Чырвонай Арміі—камандарм 1-га ранга Белоў, камдзіў Гарачоў, Герой Совецкага Саюза палкоўнік Дзенісаў і іншыя. Выконваючы абавязкі сакратара ЦК КП(б)Б т. Волкаў, старшыня СНК БССР тав. Кавалёў, выконваючы абавязкі другога сакратара ЦК КП(б)Б т. Лявіцкі, нарком унутраных спраў т. Берман, старшыня менскага горсовета т. Ванееў і многія работнікі рэспубліканскіх, акруговых, партыйных і совецкіх органаў, адданыя большэвікі, вылучаны кандыдатамі ў дэпутаты.

Вось прадстаўнікі вольнага беларускага народа, які ў брацкай сям'і совецкіх рэспублік, пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна, дасягнуў цудоўнага росквіту сваіх творчых сіл, здабыў сваё шчасце,ператварыў раней прыгнечаную Беларусь у квітнеючую соцыялістычную рэспубліку. Кожнае з гэтых імён раскрывае велічную карціну росту людзей.

— Перад вамі сёння выступае жанчына, у мінулым зусім цёмная, непісьменная. Толькі дзякуючы комуністычнай партыі і вялікаму Сталіну, я стала пісьменнай, навучылася кіраваць не толькі трактарам, але і нароўні з іншымі членамі ўрада кіраваць дзяржавай. Перад вамі былая батрачка, якая зараз заклікана вырашаць вялікія дзяржаўныя справы. Гэта магчыма толькі ў нас, у краіне соцыялізма, — сказала сваім выбаршчыкам Соф'я Рачок, знатная трактарыстка-брыгадзір, член Прэзідыума ЦВК БССР, кандыдат у дэпутаты Совета Нацыянальнасцей.

Ім—лепшым сынам і дочкам совецкага народа—аддадуць свае галасы рабочыя і работніцы, калгаснікі і калгасніцы, чырвонаармейцы і камандзіры, служачыя і прадстаўнікі совецкай інтэлігенцыі, хатнія гаспадыні і пенсіянеры, аб'яднаныя адным парывам—паслаць у Вярхоўны Совет людзей, якія і далей павядуць нашу квітнеючую краіну соцыялізма па шляху Леніна—Сталіна.

«Той-сёй задае пытанне: «Ну што-ж, я пайду галасаваць, бо выстаўлены ўсяго адзін кандыдат, ён усёадно пройдзе». Думаць так—памылка, грубая памылка.

І ў капіталістычных краінах пры выбарах здараецца, што галасуюць за аднаго чалавека. Гэта здараецца звычайна ў тых захалусных мястэчках, дзе ўсяго пяцьдзесят выбаршчыкаў з дваранскай чэлядзі і адзін лорд, якога і «выбіраюць». А калі ў нас у радзе месц кандыдаты здымаюць свае імёны на карысць аднаго кандыдата—гэта з'яўляецца вынікам іх соцыяльнага родства і агульнасці іх палітычных мэт. Дзесяткі і сотні тысяч выбаршчыкаў пасля грунтоўнага абмеркавання сышліся на адным кандыдату. Гэта і ёсць адзнака соцыялізма, адзнака таго, што ў працоўных мас няма і не можа быць унутраных супярэчнасцей, такіх унутраных супярэчнасцей, якія ёсць унутры буржуазнага грамадства.

Я вам скажу проста: калі ў нас пераважная большасць выбаршчыкаў апусціць свае бюлетэні ў урны, многія фашысцкія важакі падумаюць: «глядзіце, там не толькі армія моцная, але за арміяй стаіць яшчэ большая сіла» (З прамовы таварыша Калініна на сходзе выбаршчыкаў Выбаргскага і Краснагвардзейскага раёнаў Ленінграда).

Не трэба забывацца, што ворагі рабочага класа, ворагі соцыялізма будуць спрабаваць скампраметаваць нашых кандыдатаў, правесці сваіх. Ашалелыя трацкісцка-зіноўеўска-бухарынскія бандыты не спыняюцца ні перад чым. Тры гады назад яны вырвалі гарачае сэрца С. М. Кірава, сёння яшчэ не выкрытае ахвосце іх можа нашкодзіць у праўдзенні выбараў. Быць пільнымі да дзейнасці ворагаў—вось аб чым напамінае 3-годдзе з дня смерці С. М. Кірава.

Беларускі народ, з вялікім уздымам і натхненнем правёўшы першы адказны этап выбарчай кампаніі, паказаў сваю моцную сувязь з партыяй Леніна—Сталіна, гарачую любоў да свайго настаўніка і друга—першага кандыдата народаў усяго Совецкага Саюза ў дэпутаты Вярхоўнага Совета—таварыша Сталіна. І 12 снежня, ва ўрачысты дзень выбараў—першых выбараў на аснове Сталінскай Канстытуцыі—усеагульных, роўных і прамых пры тайным галасаванні вольны і шчаслівы народ Совецкай Беларусі прыдзе да выбарчых урнаў пад сцягам партыі Леніна—Сталіна. І галасуючы за жалезнага палкаводца магутных чырвоных войск, першага маршала Саюза ССР—Клімента Ефрэмавіча Варашылава, за ўсіх сваіх кандыдатаў, ён будзе галасаваць за вялікага, роднага Сталіна, за партыю Леніна—Сталіна, якая вядзе народы СССР да новых гістарычных перамог, да завяршэння пабудовы комунізма.

ПАСТАНОВА

акруговай выбарчай камісіі Аршанскай выбарчай акругі па выбарах у Совет Саюза аб рэгістрацыі кандыдата ў дэпутаты Совета Саюза

Данііла Якаўлевіча Навіцкага

Разгледзеўшы паступіўшыя ў акруговую выбарчую камісію дакументы аб вылучэнні кандыдатур у дэпутаты Совета Саюза Вярхоўнага Совета СССР, акруговая выбарчая камісія, устанавіўшы поўную адпаведнасць прадстаўленых дакументаў з артыкуламі 56, 57, 58, 60 і 61 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР», **пастанавіла**—на аснове артыкула 60 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР» зарэгістраваць для балатыроўкі ў Совет Саюза Вярхоўнага Совета СССР па Аршанскай выбарчай акрузе, выстаўленую агульнымі сходамі рабочых, служачых, інжынерна-тэхнічных работнікаў БелДРЭС імя Сталіна, завода «Чырвоны барацьбіт», ільнакамбіната, чыгуначнага вузла, байцоў і камандзіраў падраздзяленняў Чырвонай Арміі і калгаснікаў калгасаў: «Сталінскі Прызыў», «Першае мая», «Чырвоная Беларусь», «6 умоў Сталіна», кандыдатуру ў дэпутаты Совета Саюза Вярхоўнага Совета СССР **Навіцкага Данііла Якаўлевіча,** 1913 года нараджэння, члена ВЛКСМ з 1931 года, лейтэнанта Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі, пражываючага ў горадзе Оршы.

На аснове артыкула 66 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР» уключыць кандыдатуру тав. **Навіцкага Данііла Якаўлевіча** ў выбарчы бюлетэнь па Аршанскай выбарчай акрузе.



У адпаведнасці з артыкулам 65 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР», пастанову апублікаваць для ўсеагульнага ведама.

Старшыня акруговай выбарчай камісіі ФЕДАРЭНКА.

Намеснік старшыні БРАЖКО.

Сакратар АМРОМ.

Члены камісіі: ГАЛЬБЕЦКІ, МЯЖЭВІЧ, ТІХАНСКАЯ.

26 лістапада 1937 года.

Клімент Ефрэмавіч ВАРАШЫЛАЎ

ЧЛЕН ПАЛІТБЮРО

ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТА ЎСЕСАЮЗНАЙ КОМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ (большэвікоў)

НАРОДНЫ КАМІСАР АБАРОНЫ САЮЗА ССР

МАРШАЛ СОВЕЦКАГА САЮЗА

КАНДЫДАТ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР

АД МЕНСКАЙ ГАРАДСКОЙ ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ

Клімент Ефрэмавіч **Варашылаў** нарадзіўся ў 1881 годзе ў Данбасе, у сяле Верхнім, Бахмуцкага павета, былой Екацярынаслаўскай губерні. Яго бацька працаваў батраком, працяглы час шахцёрам, потым вартаўніком на чыгунцы, маці займалася падзённай работай.

З дзіцячых год Кліменту Ефрэмавічу прыйшлося адчуць цяжкую долю бедняка і пролетарыя. Яшчэ падлеткам ён вымушан быў пайсці на работу ў шахты—выбіраць калчадан, за што атрымліваў 10 кап. у дзень, а некалькі пазней разам з бацькам пасвіць жывёлу ў памешчыка і працаваць батраком у кулака. З прычыны адсутнасці сродкаў у бацькоў Клімент Ефрэмавіч вымушан быў спыніць вучобу з 3 класа земскага вучылішча, дабіваючыся павышэння сваіх ведаў на працягу ўсіх наступных год упартай і сістэматычнай самаадукацыйнай работай.

Пятнаццаці год тав. **Варашылаў** паступае «хлопчыкам» на металургічны завод «ДЮМО» пры станцыі Алчэўскай (цяпер г. Варашылаўск). Тут ён атрымаў спачатку кваліфікацыю падручнага слесара, затым слесара і, нарэшце, машыніста крана.

У 1897 годзе тут-жа ў Алчэўску ў тав. **Варашылава** адбываецца першая сутычка з царскай паліцыяй, за якой наследваў і першы арышт. На гэтым-жа заводзе тав. **Варашылаў** з групай перадавых рабочых скалаціў першы рэволюцыйны гурток. У 1899 годзе Клімент Ефрэмавіч узначаліў забастоўку рабочых-кранаўшчыкаў. У сувязі з гэтай забастоўкай яго арыштавалі, а пасля разгрому забастоўкі выгналі з завода з занясеннем у «чорныя спісы», у выніку чаго ён цэлых тры гады не мог атрымаць работы.

І толькі ў 1903 годзе тав. **Варашылаву** ўдалося паступіць у Луганску (цяпер Варашылаўград) на машынабудаўнічы завод Гартмана (цяпер паравозабудаўнічы завод імя Кастрычніцкай Рэволюцыі). Завод гэты ўжо тады быў адным з буйнейшых у краіне, а ў жыцці Луганска ён займаў рашаючае месца.

Тут-жа ў Луганску ў канцы 1903 года тав. **Варашылаў** уступіў у соцыял-дэмакратычную рабочую арганізацыю і адразу-ж прымкнуў да большэвікоў. Ужо ў 1904 годзе ён быў выбран членам Луганскага камітэта партыі.

У першую рускую рэволюцыю 1905—1907 г.г. тав. **Варашылаў,** які насіў партыйную клічку **«Валодзя»,** з'яўляўся правадыром рабочага Луганска. У лютым і ў ліпені 1905 года ён паспяхова кіраваў забастоўкай Гартманаўскага завода і быў выбран старшынёй дэпутацкага схода (фактычна совета рабочых дэпутатаў) завода. Пасля разгрому ліпеньскай забастоўкі рабочых Гартманаўскага завода Клімент Ефрэмавіч быў арыштаван, зверска збіт і пасаджан у турму, у якой знаходзіўся да канца 1905 года, калі па аднадушнаму патрабаванню падышоўшай да турмы шматтысячнай дэманстрацыі рабочых, мясцовыя ўлады вымушаны былі яго вызваліць.

У 1906 годзе тав. **Варашылаў** выбіраецца дэлегатам на IV (Стакгольмскі) з'езд партыі, па шляху на які ён у Пецярбурзе ўпершыню сустрэўся з **Леніным**. У 1907 годзе ён удзельнічаў дэлегатам на V (Лонданскім) з'ездзе партыі. На гэтых з'ездах тав. **Варашылаў** сустракаецца з **Леніным** і **Сталіным,** становіцца іх бліжэйшым саратнікам і верным вучнем.

Пасля IV з'езда пад кіраўніцтвам тав. **Варашылава** ў Луганску шырока разгарнулася работа па стварэнню баявых дружын рабочых, для якіх Клімент Ефрэмавіч асабіста двойчы прывозіў з Фінляндыі значныя партыі зброі.

У канцы 1907 года тав. **Варашылава** зноў арыштоўваюць. Перыяд сталыпінскай рэакцыі і гады ўздыму рабочага руху (1908—1914) Клімент Ефрэмавіч правёў большай часткай у турмах, архангельскай і чэрдынскай ссылках, дзе вёў палітычную работу сярод ссыльных, адначасова ўперта працуючы над павышэннем сваёй тэарэтычнай падрыхтоўкі. У 1908 годзе пасля ўдалага пабегу з г. Пенегі тав. **Варашылаў** на працягу больш, чым поўгода вёў партыйную работу ў Баку пад кіраўніцтвам таварыша **Сталіна.**



Народны камісар абароны маршал Совецкага Саюза тав. К. Е. ВАРАШЫЛАЎ у раёне манеўраў.

Клімент Ефрэмавіч з'яўляўся ў гэты час членам Бакінскага камітэта партыі і сакратаром Бібі-Эйбацкага партыйнага камітэта. Знаходзячыся ў Баку, Клімент Ефрэмавіч вёў вялікую профсаюзную работу сярод рабочых Бібі-Эйбацкага раёна.

У сакавіку 1914 года тав. **Варашылаў** вярнуўся ў Данбас з апошняй ссылкі, але праследуемы паліцыяй вымушан быў пераехаць у Царыцын, дзе працаваў на артылерыйскім заводзе, адначасова ведучы партыйную работу.

У гады імперыялістычнай вайны, працуючы ў Царыцыне, а затым у Петраградзе, тав. **Варашылаў** разам з усёй партыяй змагаўся за ператварэнне імперыялістычнай вайны ў вайну грамадзянскую. Прымаючы актыўны ўдзел у лютаўскай буржуазна-дэмакратычнай рэволюцыі 1917 года, Клімент Ефрэмавіч прымаў актыўны ўдзел і шмат часу аддаваў рэволюцыйнай рабоце сярод салдат Петраградскага гарнізона. Ён узняў на паўстанне Ізмайлаўскі гвардзейскі полк. Клімент Ефрэмавіч быў выбран членам Петраградскага Совета рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Па хадайніцтву луганскіх большэвікоў тав. **Варашылаў** быў накіраван Цэнтральным Камітэтам партыі ў Луганск, дзе быў выбран старшынёй гарадскога партыйнага камітэта, арганізаваў і рэдагаваў большэвіцкую газету «Донецкий пролетарий». У Луганску тав. **Варашылаў** быў выбран старшынёй гарадской думы, старшынёй Совета рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Асаблівая ўвага Клімента Ефрэмавічам аддавалася фарміраванню Чырвонай Гвардыі. Пад яго кіраўніцтвам рабочыя Луганска фактычна сканцэнтравалі ўладу ў сваіх руках яшчэ да Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі.

Выбраны ва ўстаноўчы сход ад былой Екацярынаслаўскай губерні па спісу большэвікоў тав. **Варашылаў** у снежні 1917 года прыехаў у Петраград. Тут ён неўзабаве быў назначан «чырвоным граданачальнікам»—старшынёй камітэта па ахове Петраграда і разам з Ф. Э. Дзяржынскім удзельнічаў у арганізацыі і рабоце ВЧК.

У сакавіку 1918 года тав. **Варашылаў** вярнуўся ў Луганск, дзе арганізаваў 1-шы Луганскі соцыялістычны партызанскі атрад і на чале яго вёў упартыя баі супроць германскіх акупантаў на Украіне. У красавіку 1918 года тав. **Варашылаў** аб'яднаў шматлікія украінскія чырвонагвардзейскія атрады ў V Украінскую армію і арганізаваў прарыў гэтай арміі праз кальцо германскіх войск і данскіх белаказакаў да Царыцына. Да пачатку ліпеня 1918 года тав. **Варашылаў** прывёў у Царыцын магутную шматтысячную Чырвоную Армію.

У кіраўніцтве барацьбой на Паўднёвым фронце, у герайчнай абароне Царыцына тав. **Варашылаў** стаў першым памочнікам таварыша **Сталіна,** будучы паслядоўна камандуючым Царыцынскім фронтам, намеснікам камандуючага і членам Ваенна-Рэволюцыйнага Совета Паўднёвага фронта, камандуючым X арміяй, абараняўшай Царыцын. У канцы 1918 года пасля вызвалення Украіны ад германскага ярма тав. **Варашылаў** быў назначан Народным Камісарам Унутраных Спраў Украінскай Рэспублікі.

У маі 1919 года тав. **Варашылаў** у якасці камандуючага войскамі Харкаўскай ваеннай акругі кіраваў ліквідацыяй мяцежа Грыгор'ева, затым у якасці камандарма XIV кіраваў абаронай Украіны ад дзенікінцаў і петлюраўцаў. У лістападзе 1919 года ён быў назначан членам Рэвваенсовета I Коннай арміі.

Асабіста кіруючы разам з тав. **Будзённым** Коннай арміяй, тав. **Варашылаў** удзельнічаў у ажыццяўленні сталінскага плана разгрому Дзенікіна (у 1919—20 гадах), у вызваленні Украіны ад белапалякаў (у 1920 годзе), у ліквідацыі врангелеўскага фронта. У сакавіку 1921 года тав. **Варашылаў** быў паслан X партыйным з'ездам на чале групы дэлегатаў з'езда на ліквідацыю кранштацкага мяцежа. Клімент Ефрэмавіч з'явіўся ініцыятарам рашучых мер супроць мяцежнікаў, натхніцелем і ўдзельнікам паспяховай атакі па ільду Кранштацкай крэпасці.

Назначаны ў 1921 годзе Камандуючым Паўночна-Каўказскай ваеннай акругай, тав. **Варашылаў** поўнасцю ліквідаваў на Паўночным Каўказе бандыцкія выступленні астаткаў белагвардзейшчыны. Ён прымаў дзейсны ўдзел у арганізацыі аўтаномных соцыялістычных рэспублік на Паўночным Каўказе. У 1924—25 годзе Клімент Ефрэмавіч камандаваў Маскоўскай ваеннай акругай. З 6 лістапада 1925 года пасля смерці **М. В. Фрунзе** тав. **Варашылаў** бязьменна працуе Народным Камісарам па Ваенных і Марскіх Справах, а з 21 чэрвеня 1934 года—Народным Камісарам Абароны СССР.

Пад кіраўніцтвам таварыша **Сталіна** на базе пераможнага выканання першай і другой пяцігодак тав. **Варашылаў** правёў карэнную рэканструкцыю Чырвонай Арміі, ператварыўшы яе ў лепшую армію ў свеце.

На працягу ўсяго свайго жыцця, усёй сваёй партыйнай работы Клімент Ефрэмавіч **Варашылаў** з'яўляецца адным з лепшых прадстаўнікоў старай большэвіцкай гвардыі і яе кіруючага штаба—Цэнтральнага Камітэта. Непахісны большэвік, непрымірымы барацьбіт за ленінізм, ён пад кіраўніцтвам **Леніна** і **Сталіна** і ў гады барацьбы з царызмам, і ў рэволюцыю 1917 года, і ў совецкі перыяд вёў і вядзе непрымірымую барацьбу супроць усіх і ўсялякіх ворагаў рэволюцыі, ворагаў народа. Трацкісты, зіноўеўцы, бухарынцы, буржуазныя нацыяналісты—усе гэтыя прэзрэнныя ворагі соцыялізма і народа, якія ператварыліся ў прамых шпіёнаў германа-япона-польскай разведкі, адчулі на сабе ўсю сілу варашылаўскіх удараў.

З 1921 года тав. **Варашылаў** бязьменны член ЦК ВКП(б), а з 1926 года—член Палітбюро ЦК ВКП(б).

Вышаўшы з радоў рабочага класа тав. **Варашылаў** быў і застаецца сапраўдным сынам свайго вялікага народа.

За баявыя заслугі, мужнасць і майстэрства ў барацьбе з ворагамі совецкага народа тав. **Варашылаў** мае наступныя ўзнагароды:

Ордэн Чырвонага Сцяга ў 1920 годзе за разгром белых на Паўночным Каўказе, за захоп І Кубанскага корпуса на чале са штабам.

Ганаровую рэволюцыйную зброю з ордэнам Чырвонага Сцяга ў 1920 годзе за паспяховую ліквідацыю врангелеўскага фронта.

Ордэн Чырвонага Сцяга ў сакавіку 1921 года за ліквідацыю Кранштацкага мяцежа, за мужнасць і майстэрства пры штурме Кранштацкай крэпасці.

Ордэн Чырвонага Сцяга ў 1925 годзе за паспяховую ліквідацыю бандытызма ў Паўн.-Каўк. Ваен. Акрузе.

Ордэн Чырвонага Сцяга ў 1930 годзе ў сувязі з 10-годдзем І Коннай і 12-годдзем РСЧА па шматлікіх хадайніцтвах сходаў рабочых, сялян, чырвонаармейцаў.

Ордэн Леніна ў лютым 1935 года ў сувязі з 15-годдзем І Коннай арміі.

Ордэн Чырвонага Працоўнага Сцяга УзбССР—у лютым 1930 года.

Ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга Таджыкскай ССР—у студзені 1933 года.

Ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга ЗакССР—у лютым 1933 года.

За выключныя заслугі перад Радзімай Кліменту Ефрэмавічу **Варашылаву** прысвоена званне Маршала Совецкага Саюза.

ТРОХГОДДЗЕ З ДНЯ СМЕРЦІ С. М. КІРАВА

Тры гады назад ад рукі подлых наймітаў фашызма, трацкісцка-зіноўеўскіх бандытаў, згасла агністае сэрца Сяргея Міронавіча Кірава.

Памяць аб любімым Міронычы будзе вечна жыць у нашых сэрцах, заклікаючы да барацьбы з усімі ворагамі народа, да барацьбы за канчатковую перамогу комунізма.

КІРАВУ

Мне не забыць пра тыя дні,
Глыбокі след ад іх у сэрцы...
Здаецца зноўку ў цішыні
Гудкоў жалобны плач нясецца.
У горы вёскі, гарады,
У горы ўся мая краіна.
Ў жалобе мудры правадыр
Схіліўся над абліччам сына...
З'яднаў нас, Кіраў, вобраз твой.
І ў развітання дзень апошні
Мы прысягнулі над труной
Фашысцкіх наймітаў зніштожыць.
І мы ідзем праз веліч дзён
З тваёю радасцю крыштальнай;
Мы з ёю Сталінскі закон
Сям'ёю дружнай прывіталі.
Калі-б ты жыў, народ цябе
У Совет абраў-бы дэпутатам.
Таму мы сёння у журбе,
Таму і боль такі ад страты.
... Ты не памёр!—жывеш між нас,
Вялікі сын свайго народа.
У нашых сэрцах не пагас
Прамоў тваіх магутны водгук!

29.XI.1937. **Пімен ПАНЧЭНКА.**



НАШ КІРАЎ—ЖЫВЫ!

Без слёз мы ішлі у смяротны паход,
У жудасны бой пад Сівашам.
Ніколі не плакаў так горка народ,
Як плакаў над Кіравым нашым.

Вялікая страта. Нявымерны жаль,
Глыбокі, як Чорнае мора.
З вачэй у радзімы сцякае сляза
Народнага смутку і гора.

Магутны народа вялікага гнеў,
Нянавісць да ворагаў—люта.
Радзіма мая стары свет страсяне
За сына, за гора, за смутак.

Чяхай сёння ленінскі сцяг баявы
Агорнуты сумам-тугою,—
У справах радзімы наш Кіраў—жывы,
Як вобраз бясстрашны героя.

Любімы, тваё мы высока імя,
Як праўду, нясем па сусвеце,
І слухае гоман народны зямля:
— Наш Кіраў навекі бяссмерцен!

Калі-ж загарыцца рашаючы бой,
Прыпомнім мы цяжкую страту.
Заплаціць нам вораг вялікай крывёй
За Кірава—роднага брата.

29.XI.1937. **Анатоль АСТРЭЙКА**

У ДНІ НАРОДНАГА ГОРА

(1-е СНЕЖНЯ 1934 г.).

Горад рана ўставаў.
Над Нявой
Берагі у глыбокіх снягах.
З першаснежаньскай яснай зарой
Быў увесь Ленінград на нагах.

Чалавек каля Смольнага йдзе,
На снягу пакідае сляды.
Ты куды гэтак рана ідзеш?
Ты спяшаеш, таварыш, куды?

Супыніся—Міроныч забіт,
Большэвік, правадыр дарагі...
Спадарожнік пра шлях свой забыў
І слязу ураніў на снягі.

Больш няма баявога ў жывых,
Вырваны ворагам з нашых радоў.

Чутна—воды шырокай Нявы
З гневам б'юцца аб бронзу ільдоў.

Людзі гора у сэрцах нясуць,
Чорным крэпам авіта зямля.
Раздзяліць гэта гора і сум
Правадыр наш прышоў ад Крэмля.

Ён з байцамі стаіць над труной,
За труною з народам ідзе,
Падымаючы мужных на бой
Ў гэты горны аснежаны дзень.

Затрашчалі ільдзіны Нявы,
Над труной словы клятвы гучаць:
— Кожна капля ягонай крыві
Будзе к ворагам помстай палаць!

28.XI.1937. **Міхась КАЛАЧЫНСКІ**



С. М. КІРАЎ сярод ударнікаў вучобы ў ЦПКіА, 6 чэрвеня 1934 г. (Ф).

Аб марксісцка-ленінскім выхаванні комуністаў

(З прамовы тав. Кірава на пленуме Ленінградскага абласкома і гаркома ВКП(б) 10 кастрычніка 1934 года)

Пытанне аб павышэнні ідэйнага ўзроўню членаў партыі, якое мы паставілі на гэтым пленуме,—адно з самых надзенных пытанняў, і будзе памылкай, калі мы ўсё гэтае пытанне звядзем да фармальнай вучобы. У нас ёсць велізарная сетка гурткоў, школ і т. д., дзе атрымліваюць папаўненне ведаў. Тут многа новага, тут многа новых умоў, велізарная колькасць людзей, і трэба асобна падумаць аб паляпшэнні сістэмы кіраўніцтва гэтай сеткай.

Але мне здаецца, што мы зробім вялікую памылку, калі працуючы на мясцах, на фабрыках і заводах, мы будзем чакаць агульнага трафарэта, які-б нам апрача існуючых форм вучобы даў новыя формы. Гэта не выйдзе.

Я думаю, што на кожным заводзе трэба праяўляць (няма чаго баяцца, ніякага граха ад гэтага не выйдзе) больш пачыну. больш творчасці, каб уцягваць больш людзей у вучобу, пачынаючы ад вярхоў актыва і не забываючы самых шырокіх мас членаў партыі.

Ставячы гэтае пытанне, мы не можам абмежавацца фармальнай навучальнай сеткай, таму што ўсё жыццё партыі, уся яе работа ёсць велізарная марксісцка-ленінская школа—такою яна і павінна быць. Мы павінны паставіць справу так, каб кожнае нашае мерапрыемства—пастанова, рашэнне, дэкрэт мелі папулярнае, ідэйна-ленінскае абгрунтаванне, якое павінна быць даступна шырокім масам, шырокім пластам партыі і беспартыйным працоўным...

Трэба, каб кожны ўнутры сябе адчуваў моцную партыйную дысцыпліну. каб член партыі ўсё аддаваў партыі і каб тое, што ён атрымлівае ад вучобы, ад самаадукацыі, ішло на справу партыі. Іншы практычны работнік разважае прыкладна так: «Як адарвацца ад работы і заняцца вучобай, калі цябе на месцы няма, без цябе нічога не выйдзе, як-жа сёння ў мяне на заводзе; я, моў, склікаў прапагандыстаў, актыў, як-жа я не прыду». І вось прыдзе, пакажацца «яснае сонейка», не ведае, у чым справа, сядзе ў куточак, як святы, пасядзеў поўгадзіны і вось, бачыце, масавую работу правёў *(смех)*. Так лепш не прыходзіць, а калі ўжо прыходзіш, прыходзь падрыхтаваным, раскажы, як і што трэба рабіць. Трэба пачынаць узнімаць большэвіцкае выхаванне з нашых партыйных кадраў. Паўтараю, трэба не толькі паперамі, цыркулярамі дзейнічаць, а так паставіць нашу работу, каб кожнае рашэнне, нават такое, напрыклад, як выключэнне з партыі (аб чым тут гаварылі), правесці так, каб чалавек зразумеў, за што яго выключылі. Калі мы пакаралі, запісалі вымову, трэба каб чалавек зразумеў, за што яму гэту вымову далі, трэба навучыць гэтага чалавека, каб ён у наступны раз вымовы не атрымаў, каб ён справіўся на рабоце. Гэта і будзе большэвіцкае выхаванне членаў партыі.

З выступлення таварыша М. І. Калініна

на сходзе прадстаўнікоў совецкай працоўнай інтэлігенцыі Ленінграда 26 лістапада 1937 года

Першае, што характарызуе дэмакратычнасць нашага ладу, гэта тое, што ў нас няма капіталістаў, што ў нас няма эксплаататарскіх класаў. Вось вам першая адрозніваючая якасць совецкай дэмакратыі. Бо для кожнага-ж ясна, што якая-б ні была «дэмакратыя», але там, дзе жывуць побач Ракфелер і просты рабочы, дэмакратыя толькі пусты гук. Велізарная адлегласць аддзяляе простага рабочага, які жыве толькі продажам сваёй рабочай сілы, сваёй працай, які зарабляе грашы, ад мільярдэра; тут якую форму дэмакратыі ні прыдумвай, але пакольві мільярдэр застаецца мільярдэрам, яна ўсёроўна пойдзе ні за што. Значыцца, першая адрозніваючая рыса совецкай дэмакратыі тая, што яна вызвалена ад улады капітала.

Затым у нашай краіне адсутнічаюць класавыя супярэчнасці. У кожнай капіталістычнай краіне пры вырашэнні любой дзяржаўнай справы сутыкаюцца супярэчлівыя інтарэсы розных капіталістычных груп. Возьмем наступны прыклад: у Маскве мы зараз зносім цэлы рад дамоў і будуем новыя магістралі. Гэта не так проста зрабіць у капіталістычнай краіне. Парыж, Лондан, Н'ю-Ёрк вельмі і вельмі церпяць ад прыватна-капіталістычных інтарэсаў. Пры планіроўцы такога горада,—калі ласка, купляйце кожны аршын зямлі, калі ласка, плаціце землеўладальнікам шалёныя грошы. У буржуазных краінах кожны прагрэсіўны крок як у гарадскім будаўніцтве, так і ў іншых галінах жыцця, тармозіцца зацікаўленымі групамі капіталістаў. Таму зусім натуральна, што ў капіталістычных краінах кожнае мерапрыемства натыкаецца на прыватна-капіталістычныя карыслівыя інтарэсы. Вось гэты элемент у нашай соцыялістычнай краіне адсутнічае, паколькі ў нас няма варожых класаў, у нас адсутнічаюць і класавыя супярэчнасці. Зусім не выпадкова, што Сталінская Канстытуцыя праваздгалошана іменна зараз, калі ў нас пабудован соцыялізм і ліквідаваны класавыя супярэчнасці.

Наша краіна адрозніваецца яшчэ і тым, што за мінулыя 20 год,—я думаю, што не хвалюся, а проста канстатую факт,—што за гэтыя 20 год нязмерна вырас як палітычны, так і культурны ўзровень нашых мас.

На маю думку, гэта так. *(Апладысменты)*. У той час, калі літаральна ва ўсім капіталістычным свеце мы бачым у сучасны момант або застой, або дэградацыю мастацтваў і навукі, у нас у Совецкім Саюзе мастацтва і навука перажываюць бурны росквіт. Высокі палітычны і культурны ўзровень мас—адрозніваючая рыса совецкай дэмакратыі.

Чацвертай адрозніваючай якасцю совецкай дэмакратыі я лічу адзінства мэтаў усяго нашага народа. Возьмем для прыкладу хаця-б маючую найбольшыя поспехі капіталістычную дзяржаву. Пануючыя класы такой дзяржавы не маюць такой мэты, якая аб'ядноўвала-б усіх чэсных людзей, мэты, якая натхніла-б людзей, якая ўзнімала-б людзей да гатоўнасці ахвяраваць усім, аж да свайго жыцця. Нават у момант вайны ў буржуазных краінах велізарная праслойка пануючага класа марадзёрствуе, спекуліруе, шукае нажывы.

А ў нас? У нас ва ўсяго народа ёсць агульная мэта. Гэта мэта—барацьба за пабудову комунізма. *(Бурная авацыя)*.

Зараз у нас зацверджана Канстытуцыя, якая гарантуе кожнаму права на працу, права на адпачынак, права на адукацыю, права на забяспечаную старасць. Зараз мы бачым уласнымі вачыма, адчуваем уласнымі рукамі, як з года ў год расце наш дабрабыт. Цяпер кожны з грамадзян нашай краіны лічыць комуністычнае грамадства ўпаўне дасягаемым. *(Бурныя апладысменты)*.

Ці не ясна, што совецкая дэмакратыя—гэта самая дасканалая дэмакратыя ў свеце. *(Апладысменты)*.

Совецкі ўрад, партыя, таварыш Сталін імкнуцца прыцягнуць найшырэйшыя масы да непасрэднага кіравання дзяржавай. Задачу развіцця совецкай дэмакратыі можа падняць толькі ўвесь народ. Удзелам у выбарах совецкіх органаў працоўныя масы бяруць на свае плечы грандыёзную задачу. З гэтай задачай яны справяцца, бо яны кіруюцца вучэннем Маркса—Энгельса—Леніна—Сталіна. *(Бурныя апладысменты)*.

Але каб лягчэй справіцца са сваімі вялікімі задачамі, аб'яднаны дэмакра-



тычны народ павінен свабодна глядзець наперад. Таму з усімі адшчапенцамі, якія робяць загаворы за спіною народа, мы будзем распраўляцца так, як належыць распраўляцца з ворагамі. *(Бурныя апладысменты)*.

Таварышы, тут шмат гаварылі аб тым, што мы перажываем шчаслівы час. Я таксама так думаю і толькі хацеў-бы збавіць сабе гэтак год 20 *(смех, апладысменты)*, але таму, што я чалавек, які лічыцца з аб'ектыўнымі абставінамі то я мірыўся са сваім узростам. *(Смех. Апладысменты)*.

І, мне здаецца, асабліва шчаслівы час перажывае наша інтэлігенцыя. У стары час мы адносілі інтэлігенцыю да дробнабуржуазных слаёў насельніцтва. У буржуазным грамадстве вярхушачная частка інтэлігенцыі зраслася з эксплаататарскімі класамі. У нас-жа паміж заработкам радавога інжынера і заработкам рабочага не вельмі вялікая розніца. Але не толькі ў гэтым справа. Наша інтэлігенцыя шчыльнейшым чынам звязана з рабочым класам, з калгасным сялянствам. Нашы інжынеры, пісьменнікі, артысты, мастакі, паэты, педагогі высоўваюцца ў рады інтэлігенцыі ў залежнасці ад сваіх здольнасцей. Сярэдняя адукацыя, сямігодка ў нас абавязковы для ўсіх, а па сканчэнні сямігодкі кожнаму адкрыты ўсе шляхі У рады нашай інтэлігенцыі ўліваюцца найбольш актыўныя, найбольш даравітыя, найбольш здольныя, найбольш кваліфікаваныя людзі з народа.

Наша сучасная інтэлігенцыя, гэта—першае пакаленне совецкай інтэлігенцыі. Гэта плоць ад плоці совецкага народа, гэта—неаддзялімая частка нашага народа. На твары совецкага інтэлігента можна нават пазнаць характэрныя рысы і рабочага і селяніна *(Апладысменты)*. Мы нашу інтэлігенцыю будзем таксама любіць, як любім Чырвоную Армію *(бурная авацыя)*, а мы вельмі любім Чырвоную Армію. *(Апладысменты)*.

Тут гаварылі, што толькі зараз можна разгарнуць творчыя сілы. Гэта правільна. Толькі совецкі лад дае інтэлігенцыі магчымасць разгарнуць свае творчыя сілы, здольнасці, таленты. І гэта—ва ўмовах соцыялістычнай дзяржавы. Ну, а ў комуністычным грамадстве мы разгорнем такія сілы, што дух займае, калі аб гэтым падумаеш. *(Апладысменты)*.

Прывяду самы звычайны вытворчы прыклад. Вось робяць метро ў Маскве. Метро робяць і за граніцай. Скажыце, няўжо наш архітэктар, які праектуе станцыі метро, знаходзіцца ў такім-жа становішчы, як, дапусцім, архітэктар у Парыжы? Бо і ў Парыжы творчасць штурхае архітэктара да таго, каб даць публіцы прыгожасць, зграбнасць, выгоду, бо і яму хацелася-б стварыць шэдэўр—прыгожы, выдатны твор. Гэта натуральна. Я думаю, што кожны архітэктар імкнецца да гэтага. А ці можа ён даць у буржуазным грамадстве волю свайму творчаму размаху? Не, не можа. Чаму? Ды таму, што там метро робіць капіталіст. А капіталіст робіць метро не для стварэння шэдэўра, ён робіць капіталістычнае прадпрыемства для атрымання прыбытку. Ды і сам-жа капіталіст звязан грашыма: бо калі будаўніцтва абыйдзецца яму дорага—будуць страты.

А ў нас? У нас усё будуе соцыялістычная дзяржава. У свеце няма ні аднаго капіталіста, які быў-бы так багат, як совецкая соцыялістычная дзяржава. *(Апладысменты)*. Калі ў нас даюць заданне архітэктару, яму гавораць, што трэба пабудаваць такі будынак, які адпавядаў-бы інтарэсам народа, яго выгодам і мастацкім густам.

Розніца ў становішчы інтэлігенцыі ў буржуазным і ў соцыялістычным грамадстве вынікае ў рэзультаце таго, што там ва ўладзе капіталісты, а тут—працоўныя. Наш народ гаворыць архітэктару: зрабі мне метро, але таму што гэтым метро будуць карыстацца масы, то не думай аб прыбытку, а думай аб тым, што чалавеку прыдзецца ездзіць на гэтым метро на работу і з работы, думай аб тым, каб чалавек не стамляўся пры паездках на метро. Вось вам розніца ў становішчы інтэлігенцыі ў капіталістычным свеце і ў нас. Гэты прыклад, які я прывёў, можна распаўсюдзіць літаральна на ўсе творчыя праяўленні людзей разумовай працы.

Я больш скажу. У капіталістычным свеце ствараюць усе рэчы, выходзячы з жадання атрымаць прыбытак. Не дзіўна, што ў Амерыцы, якая славіцца сваёй марнатраўнасцю, па сутнасці, усе рэчы робяцца стандартным парадкам, каб яны каштавалі патанней. Так званы «сярэдні чалавек» карыстаецца такімі рэчамі. Уся жыццёвая ўстаноўка выходзіць там ад класа капіталістаў, для якога важна адно—нажыва, нажыва і нажыва. Вось мэта ўсякага капіталіста.

А вось у нас усе аб'екты—дамы, тэатры, масты, вакзалы, прадметы шырокага спажывання,—мы будзем рабіць, выходзячы з іх мэтазгоднасці, карыснасці, прыгожасці.

Можна смела сказаць, што прыгожасць нашага будучага жыцця, выгода і ўтульнасць яго залежаць у многім ад вас.

Вось, таварышы, што значыць совецкі лад, вось якая роля інтэлігенцыі ў гэтым совецкім ладзе. Як бачыце, роля, бадай, большая, чым вы мяркуеце. Гэта—вельмі ганаровая роля. Мы гаворым, што наша краіна будзе першай у свеце ў галіне мастацтва і навукі. Я таксама так думаю. Але для гэтага трэба працаваць, удасканальваць наша жыццё і самому ўдасканальвацца. І, калі вы хочаце, каб краіна як мага хутчэй крочыла наперад,—разгортвайце ва ўсю вашы творчыя сілы. *(Працяжныя апладысменты)*. Я магу вам гарантаваць, што развіццё вашых творчых сіл напоўніць індывідуальнае жыццё кожнага з вас выключна багатым зместам. *(Апладысменты)*.

Таварышы, 12 снежня—усе будзем галасаваць за комуністычную партыю, за выразальніка народных спадзяванняў—таварыша Сталіна. *(Бурныя апладысменты, пераходзячыя ў авацыю, крыкі: «Ура»)*.

Міхась Лынькоў

Уладзімір Грыгор'евіч Ванееў

«... Едзеш у мароз, у завею, а ноч цёмная, цёмная... Зашыешся ў салому, прыслухаешся да бурана, ды так і задрэміш... І тут як садануць табе прыкладам у бок,—крык, гвалт:

— А ну, з дарогі вярні, чорт, д'ябал! Не бачыш, гасударавы людзі ідуць...

Адзін пад бок цябе б'е, другі салдат каняку твайго верне з дарогі, у снег, у ноч, у непраглядную замець...

Ачухаешся, глядзіш: ідзе-брыдзе па дарозе людзей чарада—хілыя, бледныя, адзяжонка на іх—вей-вецер... А па бакох салдаты—ледзяныя сусолкі на вусах, башлыкі пасярэбраны галунам і марозам. Сярдзіты народ, пахмуры народ... Ды конная варта яшчэ... Свісцяць бізуны, людзей падганяюць.. А кандалікі-кандалы пазоньваюць—дзын-дзын... дзын-дзын... А дзесьці там, пад лесам, воўчыя агні гараць, даносяцца праз буран воўчыя галасы...

— Страшна гэта, дзед?

— Вядома, страшна... То-ж людзей паднявольных у Сібір вядуць. На катаргу, у турму...

— За што-б то, дзед?

— Гм... Мал ты яшчэ, не табе зразумець...»

❦

Гэта дзедаў расказ. Гэта першыя дзіцячыя ўспаміны. Дзед быў фурманам, вазіў на сваім каняку купецкія тавары на Вятку. на Екацерынбург. Часта сустракаў перасыльных, расказваў унуку пра гэта. Наогул, дзед быў вялікі расказчык, пражыў ён не мала, пабачыў не мала. Ён расказваў і аб тым, як сабіралі падаткі; бралі яшчэ асігнацыямі, прыахвочваючы да падаткаў бізунамі і лазінай. Дзед расказваў аб суровай мікалаеўскай рэкрутчыне, аб «іменных». Атрымае багацей такую іменную (позва на прызыў), пакліча бедняка якога, дасць яму грошай трохі і пасылае бедняка па чужой іменнай сына свайго гора гараваць, на царскую службу—катаргу. Не на год, не на два, а на дваццаць пяць год. Падыходзіць час іменных—усе ў лес, на ўцёкі. Ну, а папаўся каторы—як на той свет ідзе, навекі развітваецца з родным сялом, з сваякамі, знаёмымі. Яшчэ бадзёрыцца чалавек, ідзе—зямля дрыжыць, з падкоў іскры ляцяць... Але вочы падводзяць—сляза засціла...

— А ты, дзед, чаму ў рэкрутах не быў?

— У мяне вялікае шчасце, унуча!—і дзед урачыста стукаў, як малатком, вялікім пальцам па сталу. Палец быў



цвёрды, як дрэва, палец быў з кастаедай.

Гэтае «шчасце» выратавала дзеда ад няшчасця, ад рэкруцкай напасці.

❦

Хвор быў часта дзед, некалькі раз сабіраўся памерці. Ну, вядома, кожнага разу ўнуку даводзілася бегаць да папа:

— Бацюшка, прычасціць-бы дзеда!

— А чорт бы ўзяў твайго дзеда, толькі клопаты з ім. Прычашчай, прычашчай, а яму хоць бы хны... Хадзі тут дарэмна...

Урэшце здаўся дзед, памёр. Ізноў унуку клопаты. Просіць маці, каб ушанаваць дзеда як след, каб акуратным поп быў. За ўсё папу грошы. А тут, як на ліха, не хапае грошай, не разлічыліся як след з доўтагрывым. Пачаў дапякаць той. Толькі ў царкву сунься, а поп і крычыць:

— Грошы, калі аддасі?

Ды як загне, загне, ды пры людзях, пры ўсіх. Ды не раз і не два.

Задумвалася маці: «а чаму гэта сын у царкву хадзіць не хоча...»

❦

Такія дзіцячыя ўспаміны, дзіцячыя ўражанні. Яны засталіся на ўсё жыццё, бо яны-ж першыя фармавалі свядомасць чалавека, неўпрыкметку прывівалі тыя думкі, настроі, якія потым, пасля, развіліся ў сталыя погляды чалавека на жыццё, на зло, на праўду, на вялікі чалавечы свет.

Уладзімір Грыгор'евіч Ванееў радзіўся ў 1896 годзе ў вёсцы Шыпішэўшчына, Кацельніцкага павета, Вяцкай губерніі. Бацька—Грыгорый Ігнацьевіч—селянін. Меў ён каня, карову, дзве авечкі і тры дзесяціны зямлі. Вядома, што з такой гаспадаркі сям'ю на дзевяць ратоў (бацька маці, дзед, шэсцера дзяцей) не пракорміш. Хадзіў бацька па зімах у «зімагоры», зімагорстваваў. Так зваліся адыходныя заработкі. Ці то ад слоў «гора гараваць», ці то ад слова «горы» паходзіць зімагорская назва. Звычайна ішлі на заработкі ў горы, на медныя руднікі ў Екацерынбург, на Матазіліху.

— Было мне восем год, калі памёр мой бацька,—расказвае тав. Ванееў.—Прышоў гэта ён з зімагораў, пачаставаў дзяцей гасцінцамі, ды неўзабаве захварэў і памер. Было гэта ў 1905 годзе. Маці—Праскоўя Нікандраўна і цяпер жыве, ёй 68-мы год. Пасля смерці бацькі гаспадарка засталася на мяне ды на дзеда. Калі я скончыў вясковую школу, то ўвесь час дапамагаў дзеду гаспадарыць.

Апрача хатняй работы, працаваў я па найму: вазіў гной, працаваў на малатарні, вучыўся ў мяснікоў абразаць мяса (за ўвесь сезон вучобы ў мяснікоў плацілі 2 рублі 50 капеек), у памешчыка Лебедзева працаваў на сартыроўцы, вясной абіраў у яго бульбу і г. д. Пяцёра сясцёр зараблялі таксама, наймаліся на лета ў нянькі. Плацілі ім звычайна хлебам Заробленае аддавалі так, нібы рабілі вялікую міласць. «Толькі-ж ваш моў, і даём зарабіць на хлеб, паколькі вы сіраты...»

У 1915 годзе споўнілася мне 19 год. Вайна. Прызвалі ў царскую армію. 85 запасны пяхотны батальён, Масква, Астраханскія казармы на былой Златарожскай вуліцы. Месяц у роце, тры месяцы ў вучэбнай камандзе ваеннага часу. Суровая і бязглуздая муштра. Гадзін з дзесяць прастаяў пад ружжом. Такая, скажам, «правіннасць»—не выцер добра вакно ў пакоі фельдфебеля. За гэта «пад ружжо». Памятаю, за невялікую правіннасць усёй казарме пасля вячэрняй праверкі наладжваецца двухгадзінны «бег на месцы». І гэта да гадзіны ночы. Ні сесці, ні ўстаць потым, ні разагнуцца. Вельмі часта пасля праверкі каманда: «А ну, поўнае прысяданне, справа па аднаму гусіным шагам—арш!» Адпускоў у горад салдаты не любілі—рукі забаляць ад казырання.

Лажыліся спаць па камандзе. Раздзяваліся па камандзе: раз, два, два з палавінай, без чвэрці тры, тры!» Не паспее каторы—бяда ўсёй казарме. «Уставай, адзявайся!»—паднімае бэлітасная каманда. Адзеліся. «Лажысь, раздзявайся!» Ізноў: раз, два, без чвэрці тры, тры!» Трапіцца які няшчасны, не паспее. бяда! «А ну, станавіся на нары, бяры плявацельную урну, крычы ў яе «дурак». І стаіць няшчасны «музыкант», стаіць гадзіну, другую выкрыквае як папугай.

У дзень адрачэння Мікалая займаліся на двары палка. На Златарожскай вуліцы ўбачылі коннікаў з чырвонымі істужкамі. Начальства адразу загнала нас у казарму. А тут бачым, натоўпы народа напіраюць на вароты нашага палка. Камандзір палка выводзіць 17-ю роту з франтавікоў. Пастроіў, камандуе «Рота на ізгатоўку!» Трохі зсмяўся народ. Каманда: «Па цэлі!» Але ніхто не бярэцца за ружжы. І вось ужо народ на двары палка, народ у нашых казармах.

— Таварышы. выхадзі на вуліцу! Рэволюцыя ў Петраградзе, у Маскве, у другіх гарадах!

З музыкай пайшлі ў горад. Мітынг ля Красных варот. На Тэатральнай плошчы лавілі гарадавых... Сколькі спраў за адзін дзень! А вечарам у казарму, па дарозе ў чайную. Красата, любата,—ні чэсці, ні часавых, уздыхнулі, можна сказаць, на поўныя грудзі. Засталося тое «поўнае прысяданне» адным хіба толькі афіцэрам да генералам.

Але абмануліся мы ў сваіх спадзяваннях. Ворагі то яшчэ трымаліся, буржуазны ўрад пасылаў на фронт, патрабаваў «пабеднага канца». У маі месяцы паслалі на фронт пад Баранавічы, за станцыю Замір'е, у 3-ці Пярноўскі полк. Быў у Тарнапольскім наступленні. Але тут ужо стаў па-сапраўднаму разумець сутнасць рэволюцыі. Пачалі, разумець яе і ўсе салдаты. Прыязджаюць агітатары ад Керэнскага, ва-ўсю крычаць: «Арлы, наступаць! Засталося вайны небагата, саюзнікі з намі...» «Арлы» слухаюць, маўчаць, ды вус пакручваюць. А каторы запытае:

— А хто-ж ідзе ў наступленне?

— Да вот Растоўскі полк ідзе...

— Пойдзе ён і мы пойдзем...

А растоўцы таксама слухаюць Керэнскіх агітатараў, на пярноўцаў спасылаюцца:

— Пойдуць пярноўцы, і мы пойдзем...

Ахвотнікаў наступаць больш не знаходзілася.

❦

У снежні 1918 года тав. Ванееў уступае ў партыю большэвікоў. Атрымаў кніжку «Дэкрэты аб зямлі», гутаркі з сялянамі. Усю вёску лічаць большэвіцкай (хадзілі людзі ў заработкі, бачылі свет, вучыліся). Тав. Ванеева прызначаюць загадчыкам Халтурынскага валаснога продаддзела, вялікая работа па продразвёрстках. У 1919 годзе тав. Ванееў—інструктар Кацельніцкага павятовага выканкома. Работа па рэарганізацыі камбедаў, ліквідацыі кулацка-дэзертырскіх банд.

З сакавіка месяца 1919 года тав. Ванееў у Чырвонай Арміі—палітработнік 3-га Прыволжскага батальёна. Дзецкае Сяло—падрыхтоўка работнікаў сувязі. Кранштат. Пасля ліквідацыі неклюдаўскага мецяжа пераводзіцца на форт Красная Горка. Член парткалектыва форта, старшыня культкамісіі палка. Удзел у абароне Петраграда ад Юдзеніча.

У 1920 годзе палкавым агітатарам у Ленінградзе. З Сямёнаўскага шпіталя водпуск дамоў па хваробе. У кастрычніку ізноў у арміі, у Кацельніцкім мясцовым батальёне унутранай аховы. У снежні 1920 года накіроўваецца ў палітсектар пры Вяцкім губваенкамаце. У снежні 1921 года адпушчаны на радзіму, загадвае валасным ваенным аддзелам. У студзені 1922 г.. выбіраецца членам, потым старшынёй Халтурынскага волвыканкома, старшыня валаснай партячэйкі.

У вераскі 1922 года выбіраецца членам Кацельніцкага укома партыі і членам павятовага выканкома. З кастрычніка 1922 г. па 1930 год работа ў аддзеле ўпраўлення паветам, загадванне агульным аддзелам павятовага выканкома, намеснік старшыні і старшыня Кацельніцкага выканкома, член Вяцкага губвыканкома, член Вяцкага губкома партыі, загадчык губфінаддзелам. Пасля ліквідацыі губерніі член акрвыканкома і член бюро акруткома партыі, загадчык акрфінаддзелам і намеснік старшыні акрвыканкома.

У 1927 годзе выбіраецца членам ЦВК СССР.

З ліквідацыяй акруг (1930 г.) тав. Ванееў працуе старшынёй Вяцкага гарадскога совета. Член гаркома і член бюро гаркома партыі. У 1931 годзе выбіраецца членам Горкаўскага крайвыканкома, у 1932 годзе членам Горкаўскага крайкома ВКП(б).

На XV з'ездзе Советаў РСФСР (1931 г.) выбіраецца членам ЦВК РСФСР.

У 1932 г. згодна рашэнню Горкаўскага крайкома і ЦК ВКП(б), пасылаецца на вучобу ў Маскоўскую Промакадэмію. Правучыўся каля трох месяцаў. Калі арганізоўваліся палітаддзелы, накіраваны ЦК ВКП(б) начальнікам палітаддзела Кочанаўскага зернавога соўгаса Заходне-Сібірскага края, дзе і прабыў тры гады і правёў вялікую работу па ачышчэнню соўгаса ад класава-чужых, варожых людзей.

У 1936 годзе, па рашэнню ЦК ВКП(б) і крайкома, ізноў пасылаецца на вучобу ў Промакадэмію. Закончыў 1-шы курс, тры дні пабыў на 2-м курсе. Краіне патрэбны былі стойкія, правераныя людзі, і тав. Ванееў рашэннем ЦК ВКП(б) накіроўваецца на работу ў БССР.

На апошнім пленуме Менскага горсовета тав. Ванееў выбіраецца часова выконваючым абавязкі старшыні горсовета.

Гэткае жыццё і праца нашага кандыдата тав. Ванеева, які рос разам з краінай і вучыўся на практыцы яе гераічных будняў, змагаўся з яе ворагамі. Ад сына пакутніка-змагара да пачэснага і адказнага паста старшыні сталічнага горсовета — такі шлях, пройдзены ім.

І наша агульная думка—тав. Ванееў апраўдае высокае давер'е працоўных горада Менска, вылучыўшых яго кандыдатуру ў Вярхоўны Совет нашай вялікай і шчаслівай радзімы.

ВЫСТАЎКА „20 ГОД СОВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ“

КВІТНЕЙ, РЭСПУБЛІКА!

Немаладых год чалавек, у простым убранні, спыніўся на шырокім пляцы. Некалькі хвілін ён маўкліва глядзеў на велічны будынак, на помнік—увекавечаны ў бронзе вобраз вялікага правадыра. Чалавек уважліва агледзеў усё навакол—ён павінен пакінуць у памяці кожную дэталь бурнага гарадскога жыцця. Сваю паездку ў сталіцу на свята ён разглядаў не як адпачынак, а як пачэсную працу. І калі пасылалі яго, клапатлівага лепшага брыгадзіра, ведалі калгаснікі: ён, як усякую працу, разважна і старанна выканае даручэнне, каб, прыехаўшы, расказаць да самых драбніц аб горадзе, правядзенні вялікага свята,навінах

Гусцеў змрок. На франтоне будынка замільгацелі чырвонымі і белымі агнямі метравыя літары «Выстаўка». Яны прыгадалі чалавеку аб мэце яго прыходу сюды, і ён шпаркім крокам накіраваўся да пад'езда, уліўшыся ў няспынны людскі паток.

Прасторная зала здаецца цеснаю ад багацця рэчаў, яе запоўніўшых. Вока не можа адразу ахапіць усёй цудоўнай карціны. Тут, у залах Дома Урада, сабраны лепшыя ўзоры працы і творчасці беларускага народа. Менскія металісты, віцебскія тэкстыльшчыкі, аршанскія вышывальшчыцы, горацкія ільнаводы, шклоўскія майстры высокіх ураджаяў,—увесь народ Совецкай Беларусі ў гэтых залах дэманструе свой творчы ўздым і багацце, росквіт рэспублікі і шчасце жыцця вольнага народу—тое, што далі дваццаць совецкіх год.

Рабочыя і чырвонаармейцы, калгаснікі і студэнты, інжынеры і гаспадарнікі, хатнія гаспадыні і школьнікі спыняюцца і ўважліва разглядаюць кожную рэч—сведку соцыялістычнага росту рэспублікі. І вочы іх усцыхваюць радасцю—той радасцю, з якой разглядае майстар выдатны вынік працы сваіх рук.

Чалавек у простым адзенні выняў з кішэні кавалак паперы і старанна запісаў: прадукцыя машынабудаўніцтва Совецкай Беларусі ў параўнанні з дакастрычніцкім часам узрасла ў 61,5 раза.

Не ўсім галінам прамысловасці даводзіцца параўноўваць сваю прадукцыю з мінулым. Для многіх галін мінулае паказвае адзін просты знак—0.

І хімічнай прамысловасцю, і паліграфічнай, і торфаперапрацоўчай, і керамічнай ганарыцца Совецкая Беларусь. Яны таксама дасягнулі значных поспехаў да юбілею краіны Советаў. Дыяграмамі і здымкамі гатовай прадукцыі, новымі машынамі маляўніча расказваюць аб сваім росце фабрыкі і заводы, што бяруць такую нямудрую сыравіну, як дрэва. Іх прадукцыя—шоўк, папера, запалкі, фанера, абсталяванне дамоў. Побач—скромны прадстаўнік Барысаўскага завода імя Молатава—піяніна.

Насупроць варштатаў зіхаціць навізной і яркасцю паліроўкі мэбля. Шафы з люстрамі, нікеляваныя ложкі, сталы і крэслы з найлепшых гатункаў дрэва, цацкі для дзяцей,—тут усё, што патрэбна для культурнага жыцця. Прамысловая кааперацыя БССР выставіла сваю прадукцыю—тую, якая напаўняе крамы ў гарадах і раёнах. Доўгі рад манекенаў паказвае, якую вопратку для працоўных рэспублікі выпрабляюць фабрыкі і прамысловыя арцелі. Сукно, шэрсць, шоўк—лепшых гатункаў. Касцюмы, плацці, польты—рознастайных пакрояў.

Чалавек у простым убранні пастаяў каля манекенаў і задаволена ўсміхнуўся, убачыўшы на адным з іх копію свайго касцюма, з такога-ж тонкага сіняга сукна. Таму і не ўзнікла ў яго здзіўлення, калі ўбачыў, азірнуўшыся вакол, што ўсе апрануты не ў горшыя, чым на выстаўцы, касцюмы і плацці. Разгледзеўшы ўбранні, усіх фасонаў абутак, пастаяўшы некалькі хвілін каля новых машын, якімі абсталяваны нашы швейныя фабрыкі, ён акуратна запісаў лічбы: у лёгкай прамысловасці БССР занята 44,5 тысяч рабочых, у 1913 годзе было 5,5 тысяч, і яна выпускае на поўмільярда ў год прадукцыі.

Нельга знайсці граніц паміж прамысловасцю і мастацкай творчасцю. Менская арцель «Новы шлях» сваім экспанатам выставіла карціну «Дуэль Пушкіна». Гэта сапраўдны мастацкі твор, і ў той жа час—прадукцыя прамысловай арцелі. Тое-ж можна сказаць аб вышыўках кашуль і каўроў, аб працы т. Белова з арцеллю «Усход», майстэрска выразаўшага з дрэва тачанку Чапаева, калгасную тройку,—бліскучыя мастацкія рэчы.

Плады працы шматтысячнай арміі рабочых рэспублікі гавораць адно. Совецкая Беларусь стала краінай фабрык і машын!

Новыя залы раскрываюць новымі фарбамі цудоўную рэчаіснасць

Саха з бараной і цэп з сяўнікам стаяць у кутку залы—даўно забытыя нашай вёскай «сродкі вытворчасці», помнік мінулага, дзён прыгнёту і жабрацкага жыцця.

Сёняшняя рэчаіснасць—заможнае і шчаслівае жыццё калгаснай вёскі.

Некалькі новых лічбаў запісаў знаёмы нам наведвальнік, калгасны брыгадзір: у БССР трактароў 8.548, камбайнаў—415...

Пукі налітага буйным зернем жыта, з цяжкім коласам пшаніцы, пышнага аўса і ячменю.

Яго ўвагу спыніў партрэт звеннявога т. Лепіліна, што вырасціў 13,5 цэнтнераў ільну з гектара. Зацікавіла і тое, што калгас «Соцыялізм» на Шклоўшчыне сабраў пшаніцы 20 цэнтнераў з гектара.

— Гэта—ураджай! Калі добра рукі чалавек прыкладзе да зямлі, даглядзіць яе,—вось як наша зямля дзякуе!

Ганарацца ўраджаем ільнаводы Совецкай Беларусі. Яркія вынікі працы і жывёлаводаў, і калгасаў, якія вырошчваюць бульбу, гародніну, каноплі, садавіну. Плады ўраджаю: каўшы буйнай бульбы, качаны шырокалістай капусты, горкі сакавітых яблык, высокія сцяблы канапель—вынік узбраення калгасаў машынамі, сумленнай працы калгаснага сялянства. І канатнік, і каўчуканос кок-сагыз, і вінаград, і табак—не госці на выстаўцы. Яны маюць законнае права быць экспанатамі. Іх узгадавалі клапатлівыя рукі калгаснікаў Аршаншчыны, Рагачоўшчыны і іншых раёнаў.

Совецкая Беларусь двума сталінскімі пяцігодкамі ператворана ў краіну квітнеючай калгаснай гаспадаркі.

Тут-жа вітрыны тае прамысловасці, што бярэ, як сыравіну, дары калгаснай зямлі. Рознае печыва з пшаніцы, цукеркавыя вырабы, рыбы—ад сома да фарэлі, віны. Вырабляецца гэта ў Менску, Гомелі, Магілеве, у многіх гарадах і мястэчках калгаснымі фермамі, а спажываецца ўсім народам рэспублікі.

Усё аблічча краіны стала іншым. Якія кварталы шматпавярховых дамоў выраслі ў гарадах! Якія сады і скверы ўпрыгожваюць іх! А перспектыву будучага—цудоўную, захапляючую перспектыву—акрэсліваюць архітэктурныя праекты—праекты няспыннага далейшага будаўніцтва, якія праз кароткі час ператворацца ў рэальнасць.

Аб поспехах навукова-даследчай працы расказваюць дыяграмы і экспанаты інстытутаў Беларускай Акадэміі навук. Пра клопаты партыі і совецкага ўрада аб людзях, іх культурным росце, узбраенні навукай, аб ахове здароўя гавораць шматлікія матэрыялы.

І зноў на паперку скромным наведвальнікам, калгасным брыгадзірам, запісваюцца лічбы, якія красамоўней за словы: у БССР 22 ВНУ, 25 тэхнікумаў... 35.000 студэнтаў. Выдаецца 201 газета з тыражом 808 тысяч экземпляраў. Лепшыя кнігі майстроў мастацкага слова і класікаў марксізма выдадзены на беларускай мове і даступны шырокім народным масам.

Толькі на народную асвету ўрад рэспублікі адпусціў звыш поўмільярда рублёў. На кожнага чалавека прыпадае 100 рублёў. Якім нікчэмненькім выглядае у параўнанні з гэтым бюджэцік царскага міністэрства «народнага зацямнення», па якому прыпадала 80 кап. «на душу».

Пражыта 20 совецкіх год! І якіх велізарнейшых поспехаў, якога грандыёзнага росквіту дасягнула БССР пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна! Як шчасліва жыве беларускі народ!

... У залах выстаўкі—усё шумней, збіраецца ўсё больш народ. Але не толькі сюды, у гэтыя залы Дома Урада, удзень і ўвечары ідуць людзі—групы экскурсантаў і адзіночак. Яны таксама запаўняюць і пакоі Дома Чырвонай Арміі, дзе разгорнута выстаўка мастацкай творчасці беларускага народу і прац работнікаў мастацкага фронта рэспублікі. Сродкамі выяўленчага мастацтва, скульптуры, графікі, арнамента, дэманструецца тое-ж, што і прадукцыяй заводаў і калгасаў,—вялікі росквіт рэспублікі. Захапляюць працы мастакоў-самавучак рабочых і пагранічнікаў, калгаснікаў і студэнтаў, вышыўкі беларускіх жанчын. Магутныя творчыя сілы ў народзе абудзіла наша эпоха!

Некалькі гадзін праляцелі, як хвіліна. Перад вачыма прайшлі незабыўна яркія малюнкі. Як хочацца перадаць хвалюючыя ўражанні, узнікшыя ў думках.

І чалавек у простым убранні запісаў у кнізе водгукаў: «З вялікай радасцю глядзеў я, якіх перамог дасягнула Совецкая Беларусь пад кіраўніцтвам нашай большэвіцкай партыі. Дзякуй таварышу Сталіну за нашае шчаслівае жыццё!»

Р. Юр.



З экспанатаў выстаўкі «20 год Совецкай Беларусі». На здымках: ваза для хатніх кветак і гляк вырабу Новабарысаўскай ганчарнай арцелі «Чырвоны Кастрычнік»; мазаічная рамка для партрэта, зробленая з кавалкаў дрэва розных парод калгаснікам арцелі «Чырвонаармеец» Магілеўскага раёна Арловым.

Фота Каплінскага.

Творчасць беларускага народа

На юбілейнай выстаўцы «БССР за 20 год» досыць поўна прадстаўлена народная творчасць. У добра падабраных калекцыях экспанатаў выстаўлены работы: мастацкага рукадзелля—ткацтва і шыцця, узорчатага ткання і вышывання, вязання і пляцення з нітак; разьбы і выпальвання па дрэву; шчэпныя і дрэва-мазаічныя вырабы, а таксама інкрустацыя; пляценне з лазы, саломы, карэнняў і драўлянай стружкі; керамічныя вырабы, роспіснае і гравіраванае шкло, скульптура, графіка, жывапіс і арнаментыка. Апрача таго, прадстаўлены наборы народных музычных інструментаў—ударных, духавых і струнных.

Юбілейная выстаўка добра ілюструе карціну велізарных поспехаў Совецкай Беларусі у розных галінах народнай творчасці, за 20 год Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі дасягнутых пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна. Народная творчасць захавала за сабою нацыянальныя формы і набыла шырокі соцыялістычны змест.

Тут майстрамі народнай творчасці выступаюць надзвычайныя таленты, якія выйшлі з асяроддзя рабочых і калгаснікаў, радавых чырвонаармейцаў і камандзіраў, совецкіх служачых і працоўнай інтэлігенцыі. Раней, пры жорсткім царскім рэжыме, народнае мастацтва і творцы яго знаходзіліся пад гнетам эксплаататарскіх класаў і не маглі развівацца. А зараз усім вядома, што краіна Советаў—радзіма талентаў.

У Доме Чырвонай Арміі імя К. Е. Варашылава выстаўлена да 800 экспанатаў, якія сабраны ў розных раёнах БССР.

Цэнтральнае месца ў зале займае бюст любімага правадыра народаў таварыша Сталіна,—выдатная рэзная работа па дрэву шавецкага майстра Хрушчова з Бялыніцкага раёна.

Тут-жа прадстаўлены партрэты правадыроў сусветнага пролетарыята: Маркса, Леніна, Сталіна—мазаічная інкрустацыя па фанеры, тонкай работы Гільмана, рабочага з Жлобінскага раёна. Апрача таго, заслугоўваюць вялікай увагі лепныя скульптурныя работы настаўніка Паварыча з Нова-Беліцы, рабочага Жыркевіча, рабочага сталяра Міхалевіча з Менска. Паварыч выставіў свае скульптурныя работы «Пушкін», «Н. Остроўскі» і «Маці», выкананыя з вялікім майстэрствам. Жыркевіч прадставіў скульптуру выдатнае выкананне—«Ленін у шалашы». Міхалевіч зрабіў скульптуру «Ленін і Сталін у Горках»,—таксама цікавая работа.

За імі ідуць сапраўдныя майстры па мазаіцы: Гебелеў, рабочы завода імя Молатава ў г. Менску, і Орлоў, калгаснік з Магілеўскага раёна. Гебелеў майстэрска зрабіў мазаічныя шахматы з шматлікіх кавалкаў дрэва розных парод, а майстар Орлоў зрабіў мазаічныя настольныя вазы і рамы для карцін.

Выпальванне па дрэву прадстаўлена добрымі работамі Фейгіна з Віцебска—«Рыбакі на плытах», «Млын на р. Віцьбе» і інш. У народным мастацтве вялікую цікавасць уяўляе сабой мазаічная карціна «Сталінскі маршрут Масква—Паўночны полюс—ЗША» з партрэтамі герояў легендарнага пералёту Чкалава, Байдукова і Белякова і такая-ж карціна з партрэтам таварыша Сталіна,—мастацкай работы Каўшэўнага, электраманцёра Рэчыцкай запалкавай фабрыкі. Абедзве гэтыя карціны добра складзены з рознаколерных галовак запалак, з якіх пайшло на першую карціну 300.000, а на другую да 200.000 шт.

Сярод народных музычных інструментаў вылучаюцца самадзелкавыя скрыпкі добрай работы Паланевіча і дудкі жалейкі работы П. Маісеева, калгасніка з в. Новаселкі, Магілеўскага раёна.

У мастацкім рукадзеллі пераважае геаметрычны від арнамента, з некаторымі пераходамі ў стылізаваныя формы іншых відаў арнаментыкі расліннага і жывёльнага свету. Найбольш шырокае месца ў мастацкім рукадзеллі займаюць: два дываны, тканыя з шарсцяных нітак з багатым стылізаваным арнаментам па ўсяму полю дывана—работы А. Махнач, калгасніцы Уздзенскага раёна. Коўдры-дываны, тканыя і пакрытыя ўзорамі стылізаванай арнаментыкі—работы калгасніцы М. Лінай, з Уздзенскага раёна; карціна вышытая гладдзю на сюжэт «Ля Лукамор'я дуб зялёны» Пушкіна—мастацкай работы Дубінінай, коўдры-дываны з вышытымі вазонамі кветак—работы Патапейкі, з Асіпавіцкага раёна. Дарожка, вышытая прыгожым стылізаваным арнаментам—работы С. Віхравай.

Апрача таго, багата прадстаўлены поўныя гарнітуры нацельнай, пасцельнай і настольнай бялізны, жаночыя народныя адзенні, мужчынскія верхнія кашулі, паясы, з прыгожай аздобкай беларускім народным арнаментам.

У галярэі выстаўленых карцін вабяць увагу наведвальнікаў многія экспанаты, як, напрыклад, партрэт т. Ежова—пагранічніка Токарава, карціна «Орджанікідзе у разведцы»—Дамінскага, карціна «У дазоры»—чырвонаармейца Шчанкова, рэзная карціна па дрэву «Разведка»—работы чырвонаармейца Івінскага, карціна «Дзяўчына-лейтэнант» — работы А. Сергачова. Апрача таго, многія каштоўныя экспанаты па народнай творчасці размешчаны на выстаўцы ў Доме Урада.

Выстаўка народнай творчасці наглядна паказвае велізарны рост культуры працоўных мас БССР і вылучае з іх асяроддзя выдатных талентаў, выхаваных партыяй Леніна—Сталіна.

І. СЕРБАЎ.



З экспанатаў выстаўкі «20 год Совецкай Беларусі». Вырабы Новабарысаўскай ганчарнай арцелі «Чырвоны Кастрычнік»: кафейнік і гарлач.

Фота Каплінскага.

Дзякуй таварышу Сталіну за шчаслівае жыццё

З кнігі водгукаў пра выстаўку „БССР да ХХ-годдзя Вялікага Кастрычніка“

«Мы, калгаснікі-дэлегаты Жлобінскага раёна, адзначаем, што выстаўка сапраўды адлюстравала тыя перамогі, якіх мы дасягнулі за дваццаць год існавання і будаўніцтва. Выстаўка арганізавана вельмі ўдала і павучальна. Вялікіх заваёў дасягнула наша БССР, дзякуючы нашай комуністычнай партыі і вялікаму Сталіну».

Подпісы.

Трыццаць хатніх гаспадынь 61-га выбарчага ўчастка Менска пасля калектыўнага прагляду запісалі:

«Захоплены і шчыра ўзрадаваны пладамі нашых дасягненняў».

«Мне спадабалася ёлка, станкі і розныя вышыўкі, а таксама тое, як робяць запалкі. Цікава глядзець дзіцячы тэлефон і маленькія домікі».

Вуч. III класа 47-й школы Герасімовіч Маргарыта.

«Мы, байцы вайсковай часці, наведаўшы выстаўку, адзначаем грандыёзныя дасягненні прамысловасці і сельскай гаспадаркі беларускага народа. Мастацкае афармленне выстаўкі выдатнае».

Група байцоў.

«Якая каласальная розніца паміж былымі заводамі Якабсона і Ліўшыца і сучаснымі заводамі імя Кірава і імя Варашылава.

Калі глядзеш усе машыны для халоднай апрацоўкі металу і іншыя экспанаты, узнікае вялікая радасць за нашыя перамогі».

Рабочы.

«Мы, студэнты медыцынскага інстытута, захоплены выстаўкай. За кароткі перыяд існавання нашай Совецкай Беларусі яна асвоіла варштатабудаўніцтва і выкарыстанне усіх народных багаццяў. Мы, сыны Совецкай Беларусі, ганарымся нашай рэспублікай і жадаем ей далейшага квітнення. Дзякуй вялікаму Сталіну за шчаслівае жыццё!»

Студэнты (подпісы).

Змітрок Бядуля

Большэвік граніцы

Аляксандр Міхайлавіч Абрамаў—вылучаны кандыдатам у дэпутаты Совета Саюза ад Менскай сельскай акругі—адзін з найлепшых большэвікоў граніцы.

Большэвікі граніцы—адна з самых моцных парод, выхаваных па-сталінску, людзей. Па яркасці, напружанасці і героіцы—іх жыццё часта нагадвае легенду. Быць вартаўніком на рубяжы з фашысцкім светам—незвычайны гонар: увесь вялікі совецкі народ давярае яму ключы ад свайго сонечнага дома. На граніцу накіроўваюцца адборныя, лепшыя, вынослівыя, дысцыплінаваныя, строгія да сябе і да сваіх таварышоў, людзі з моцнай воляй. Аляксандр Міхайлавіч—адзін з выдатных пагранічнікаў.

І любоў да совецкай радзімы і нянавісць да класавага ворага тут, на лініі прымежных слупаў, дзе ў кожную хвіліну можна чакаць наскоку хітрага звера,—навостраны, як брытва. Адчуванне адказнасці за кожны драбнейшы твой учынак тут ідзе па роўнай цане з жыццём. Без сапраўднай дружбы не толькі між сабой у байцоў, але ў байцоў з лепшымі калгаснікамі ваколіцы—тут не лёгка працаваць. Кожны выдатны калгаснік прымежнай паласы—большэвік граніцы. Тав. Абрамаў арганізоўвае калгасны народ ваколіцы. Ён—іх прыяцель. Яго ўсе любяць. Ад васьмідзесяцігадовага дзеда да піонера, ад сівой бабулі да школьніцы,—усе дапамагаюць пагранічнікам выкрываць змяю пад маскай чалавека.

Там, дзе шапку можна перакінуць з капіталістычнага свету ў свет Сталінскай Канстытуцыі, нават у совецкіх дзяцей і зрок, і слых, і ўважлівасць абвостраны да апошняй магчымасці. І ёсць не мала фактаў, калі, дзякуючы пільнасці пастушка, прыводзяць на заставу шпіёна-дыверсанта.

Для арганізацыі калгаснай масы вакол байцоў граніцы ў тав. Абрамава ёсць відавочныя жывыя ілюстрацыі: тут і там. Тут, у нас, на абшырным калгасным полі працуе бадзёры атрад трактараў, а вунь там—блізенька... блізенька...—дзе вузенькія палоскі-паяскі,—вырысоўваецца на фоне неба традыцыйная, абвеяная, доўгімі стагоддзямі, фігура скручанага ў тры пагібелі мужыка-ратая з конікам і сахой. А побач—вёска, старэнькая, хаткі з падпоркамі, дзьмухні—яна рассыпляецца. А водаль на ўзгорку—панскі маёнтак—з эканомам, з прыганятамі, з бізунамі, з парабкамі, з голадам і галечай, з цалаваннем яснавяльможнай рукі, з усімі іншымі атрыбутамі векавечнага рабства. А вунь касцёл... Падмагільныя гукі званоў клічуць на рабства і спакору...

А часам з таго боку чутны крыкі, лямант і плач. Відаць гойсанне раз'юшаных жандараў. Падаткі спаганяюць? Хтосьці сухастойку выразаў у панскім лесе? Парабкі і вакольныя сяляне адмовіліся працаваць задарма ў панскім дварэ? Супроць пана або асадніка-пазнанца хтосьці адзін ці грамадой гнеўныя словы выказаў? Магчыма.

А вось—адтуль—абдзёрты худзенькі хлопчык-парабчонак, як-бы праз шчылінку, тарапіць вочы на новы вольны свет—на наша аграмаднае калгаснае поле. Яго дзівіць камбайн. За ім цікуе белапанскі жаўнер... Папаўся хлопчык... Шомпалы... Крыкі... плач... Для фашысцкай дзяржавы небяспечна, каб «хамскі сынок» глядзеў на большэвіцкую зямлю, дзе такія-ж сынкі становяцца гаспадарамі дзяржавы.

Гледзячы здалёк на такія карцінкі буржуазнага «дабрабыту», сэрца Аляксандра Міхайлавіча кіпіць гневам і абурэннем.

На дзяржаўнай мяжы і пагранічнік і калгаснік жывуць адным жыццём, аднымі інтарэсамі, радасцямі і клопатамі—каб і птушка не праляцела адтуль. Пачуцці людзей кандэнсіраваны... Чырвонае і белае маюць тут яркае кантраснае адлюстраванне.

Разам з вучобай аб пільнасці да людзей пагранічнік прыносіць калгасніку палітычную і агульную культуру. Аматарскія спектаклі, кіно, гутаркі на розныя тэмы, сходы. Актыўнасць прымежных байцоў сярод калгасных мас вельмі вялікая. Адны адных добра ведаюць, жывуць маналітнай сям'ёй. Таму зусім не дзіўна, што на



Аляксандру Міхайлавічу Абрамаву, аднаму з найвыдатнейшых пагранічных байцоў на рубяжы з фашысцкай Польшчай, спыніліся вочы выбаршчыкаў. Яго—чалавека з моцнай воляй, добрага, скромнага, пільнага—ведаюць і любяць працоўныя масы ваколіцы, давяраюць яму.

Вось вехі яго біяграфіі.

1) Нарадзіўся ў 1911 годзе.

2) На васьмым годзе жыцця—круглы сірата, беспрытульнік.

3) З 1919 па 1922 г.—у дзіцячым доме ў Петраградзе.

4) З 1922 па 1929—пастухом, парабкам і лесарубам у вёсцы Салаўёва.

5) (Ленінградская вобласць, Волкаўскі раён).

З 1929 да восені 1933 г.—рабочым Свірбуда.

6) У 1931—кандыдат партыі.

7) У 1932—член ВКП(б).

8) Увосені 1933 г. прызываецца ў рады РСЧА. Накіроўваецца ў Н-скі пагранатрад.

Чырвоная Армія становіцца яго жыццём. Аляксандр Міхайлавіч аддае ёй сябе цалкам.

Жыцця да Кастрычніка ён не памятае. Ведае аб гэтым толькі з літаратуры. Яго рост, як чалавека і грамадска-палітычнага дзеяча,—маленькі паказ росту ўсёй большэвіцкай радзімы. Яго рост—глыбокі сымвал росту ўсяго совецкага народа. Маленькі Шурка нацярпеўся даўней і голаду і холаду. Хлопчыкам жыў у Петраградзе ў падвале і праз залепленае гразёй акенца бачыў толькі частку тратуара і ногі праходжых. І ён па-дзіцячаму дзівіўся: «Зграбныя бліскучыя бацінкі—хоць забаўляйся імі нібы прыгожай цацкай. А вось—з падраных ушчэнт атопкаў вылазяць скурчаныя пальцы...»

Шура хоць гняздо меў у мацеры—прачкі. Бацька шавец загінуў у акопах імперыялістычнай вайны. Хутка ён страціў і маці. Шурка астаецца адзін-адным на петраградскіх вуліцах у людскім тлуме, нібы маленькая трэсачка на гнеўных хвалях Невы. У дзіцячым доме ён вучыцца на краўца, пачынае клапаціцца аб меншых за сябе хлопчыках, каб старэйшыя не крыўдзілі...

Пасля няўдачных пошукаў мацеры Шурка працуе аўчаром і парабкам у кулакоў, церпіць здзекі, і ў яго пачынае расці класавая нянавісць да ворагаў совецкай улады. Маленькі петраградзец, сіраціна, праходзіць цяжкую сялянскую навуку да калгасных часоў. Яго акрыляе адно—жыве свай працай...

Людзі выкоўваюцца ў справе, у працы. І сапраўдны сталінскі гарт юны Аляксандр Міхайлавіч атрымлівае на грандыёзным Свірбудзе. Ад простага, бадай, непісьменнага чорнарабочага да арганізатара мас, да члена партыі—вялізны крок. Клопаты аб людзях, аб сваіх таварышах—асноўная частка яго характару. Без гэтага ён не можа.

На Свірбудзе ён хутка становіцца ударнікам, канчае агіткурсы, вячэрнюю соўпартшколу. Ён—кіраўнік брыгады—пасля працы чытае брыгадзе газеты, інфармуе аб міжнародным становішчы. Ён клапоціцца аб культуры і дабрабыце рабочых цэха, дзе больш за тысячу чалавек. Праходзіць агіткурсы і становіцца натхнёным агітатарам. І ўсё гэта без адрыву ад вытворчасці. Ён адчувае сябе адным з сапраўдных гаспадароў будаўніцтва, выкрывае кулакоў—дэзарганізатараў працы, уваходзіць з галавой у быт, жыццё рабочых. Поспехі будаўніцтва будучай электрастанцыі напаўняюць яго радасцю і энергіяй.

Аляксандр Міхайлавіч становіцца поўнакроўным чалавекам Сталінскай эпохі. Апрача агульнай адукацыі, апрача вялікіх і малых нагрузак на грандыёзным будаўніцтве, ён з поспехам вывучае філасофію марксізма-ленінізма і асновы тэхналогіі. Яго ведае многатысячны калектыў рабочых. Усе яго любяць. Ён часта атрымлівае ўзнагароды. Комсамольцам ён—брат, старэйшым рабочым—сын...

Былы беспрытульны Шурка ўжо не сірата. Увесь совецкі народ—яго сям'я. Уся большэвіцкая зямля—яго родны дом.

Прыліў новых сіл, адчуванне адказнасці за сябе, за таварышоў. Для маладога большэвіка няма нічога немагчыма, цяжкага, недаступнага. У Аляксандра Міхайлавіча небывалыя тэмпы росту. Ён хутка праходзіць асноўныя вехі культуры, а смага да новых ведаў, да новых дасягненняў—расце і расце.

Мы так прывыклі ў штодзённым жыцці да людзей сталінскай эпохі, да большэвіцкага выхавання, што для нас усё гэта—звычайнае. Сотні тысяч дзяцей былых «нізоў» становяцца лётчыкамі, прафесарамі, камандзірамі, інжынерамі. Тысячы Шуркаў становяцца глыбока свядомымі грамадзянамі, шчыра адданымі сынамі любімай совецкай радзімы. Былыя Шуркі вырастаюць у гаспадароў нашай зямлі, у кіраўнікоў нашай магутнай дзяржавы.

Гэта ў нас—штодзеннае з'явішча.

Добра падрыхтаваным сынам радзімы, з няўхільнай воляй, з асноўнымі ведамі тэорыі Леніна—Сталіна Аляксандр Міхайлавіч прыходзіць на граніцу. А фактычна ён яшчэ такі малады... У яго пільных вачах, якія нічагуткі не выпускаюць з поля зроку, свеціцца большэвіцкая ўпэўненасць і багатае веданне жыцця. Яго свойская ўсмешка выклікае да яго сімпатыю. Яго прасторны лоб гаворыць аб моцнай мыслі. Прастата, скромнасць і вобразныя рэплікі вабяць да сябе. Кожнаму здаецца, што знаёмы з тав. Абрамавым даўно.

Здольнасці тав. Абрамава з сапраўдным размахам разгортваюцца на граніцы. Лясы, поле, хмызнякі, дарогі, рэчкі, балота яму—не навіна. Яшчэ беспрытульным хлапчуком брыў адзінюткі па вялізных рускіх прасторах. Вылі ваўкі, мігацелі фосфарам іх драпежніцкія вочы. Хлопчык цураўся іх, яго выратоўваў спрыт. А ваўкі з бярлогі старога свету?

У Аляксандра Міхайлавіча на іх вельмі востры позірк. Ніякія маскі не памагаюць. Яны пападаюцца слаўнаму пагранічніку ў сталёвыя рукі. Ён трапляе на іх і ў дождж, і ў летнюю спёку, і ў туман, і ў зімовую мяцеліцу. Як-бы нарадзіўся для граніцы... Нямала разоў жыццё яго ў небяспецы, але ці-ж Аляксандр Міхайлавіч шкадуе аддаць сваё жыццё за шчаслівую радзіму!

Па ахове граніцы таварыш Абрамаў атрымлівае чатыры заахвочванні і некалькі ўзнагарод.

У маладога большэвіка пачынаецца новая вучоба: малодшы камандзір аддзялення. За паспяховае сканчэнне школы—узнагарода. Камандуе аддзяленнем байцоў. Канчае курсы камсоргаў. Становіцца адным з лепшых пагранічнікаў. Дае большэвіцкае выхаванне пагранічнай моладзі. Глыбокая, цікавая школа. Вялікі эфект кантрастаў, на нашым і тым баку. У простых, трапных гутарках асноўным стрыжнем—вучэнне Маркса, Леніна, Сталіна. Ілюстрацыямі да іх—жыццё і мастацкая літаратура: Остроўскі, Фурманаў, Шолахаў, Серафімовіч, Горкі і шмат іншых.

У Аляксандра Міхайлавіча добры педагагічны падыход. Ён выхоўвае ў маладых байцоў любоў да совецкай радзімы і глыбокую грамадска-палітычную свядомасць. За добрую палітпадрыхтоўку, за ўзорную дысцыпліну таварыш Абрамаў атрымлівае новыя ўзнагароды.

Аляксандр Міхайлавіч нямала працуе і сярод калгаснай масы ваколіцаў. Ён сярод іх—адзін з папулярнейшых пагранічнікаў. Яго ўсе любяць за актыўнасць, за скромнасць, за дабрату.

Ён вырашае зрабіць для сябе пажыццёвай ваенную прафесію—астаецца ў Н-скім пагранатрадзе на звыштэрміновую службу. Клопаты аб людзях—мэта яго жыцця. Ён уваходзіць ва ўсе дробязі быту кожнага байца. У Н-скай пагранзаставе атрымлівае годнасць старшыні.

Жыццё слаўнага пагранічніка Аляксандра Міхайлавіча— шчаслівае, поўнацэннае. Кожны яго рух, думка, слова, дзеянне і ўсё яго існаванне цалкам накіраваны на карысць нашай вялікай Радзімы. Яго кандыдатура ў дэпутаты Совета Саюза—адна з дастойнейшых.



Другая Усебеларуская алімпіяда мастацкай самадзейнасці. Удзельніца домравага аркестра Медінстытута (Менск), студэнтка IV курса інстытута ЗІНА ЯНОВІЧ. Фота Грунтфеста.

Тэатры Масквы за 20 год

(Выстаўка ў Доме актора)

У выставачнай зале маскоўскага Дома актора размясцілася выстаўка, прысвечаная рабоце тэатраў сталіцы за 20 год.

Тут сабраны вялікі матэрыял, які паказвае шлях развіцця вядучых тэатральных калектываў краіны.

«Містэрыя Буф»—у тэатры Мейерхольда ў сезоне 1921 года; «Прынцэса Турандот»—у тэатры Вахтангава. «Бронепоезд 1469» Вс. Іванова ў Малым тэатры: «Бронепоезд» у МХАТ і інш.

Спецыяльны раздзел выстаўкі прысвечаны пастаноўкам п'ес савецкіх драматургаў на савецкай сцэне. Тут прадстаўлены макеты пастановак, эскізы касцюмаў, здымкі выканаўцаў у асобных ролях; паказана творчая работа тэатральных калектываў і многіх выдатных майстроў савецкага тэатра. Асобныя фатаграфіі паказваюць сцэнічныя вобразы, якімі ў свой час жыў тэатр і якія ўвайшлі ў яго актыў.

Вось артыст МХАТ Баталаў у ролі Ваські Окорака, Хмелеў у ролі Пеклеванага, Качалаў—Верыўнік («Бронепоезд»), Шчукін у ролі Егора Булычава. Многімі фатаграфіямі тут прадстаўлены створаны на сцэне выдатным акторам жывы і праўдзівы горкаўскі вобраз Манеўрава ў ролі Шуры. «Любоў Яравая» ў Малым тэатры ў сезоне 1926-27 года. Пашэнная—першая выканаўніца ролі Любові Яравой. П. Садоўскі ў ролі Швандзі і інш.

Выстаўлены матэрыялы Акадэмічнага Вялікага тэатра Саюза ССР. Тут і старыя і новыя пастаноўкі тэатра З новых: «Ціхі Дон» у метрах, эскізах і фото—Круглікава ў ролі Наталы, Ханаеў—Грыгорый, Перагудаў—стары Мелехаў і шмат іншых.

Дадзены матэрыялы аб нацыянальных тэатрах Масквы—яўрэйскім, латышскім, цыганскім. *І. Ш.*

Поспех чырвонаармейскага ансамбля

Ансамбль чырвонаармейскіх песень і танцаў Менскага Дома Чырвонай Арміі выступіў перад выбаршчыкамі 24-га выбарчага ўчастка з мантажам «12 песень пра нашу непераможную Чырвоную Армію, пра яе тварца і натхніцеля Вялікага Сталіна, пра яе палкаводца Клімента Варашылава». У бліжэйшыя дні ансамбль выступіць перад выбаршчыкамі ў трамвайным парку, на чыгуначным вузле і інш.

Выступленні ансамбля горача сустракаюцца рабочымі, чырвонаармейцамі і служачымі.

Э.

Міхась Калачынскі

ЗА РАКОЮ БЯРОЗАЮ...

Гараць урачыста агні,
У далечы свецяцца зоры,
Байцы ўспамінаюць пра дні,
Пра славу паходаў гавораць.
А ты мне раскажаш аб чым,
Стары мой, мой добры дзядуля?
У гэтай святочнай начы
Паданнем каторым расчуліш?
Агонь... Пасцілаецца дым...
Патрэскваюць ціха галіны.
І казачны дзед мой тады
Сваю пачынае быліну.

***

За ракою Бярозаю поўнаводнаю
Туманы павіслі, туманы халодныя.
Туманы студзёныя на зямлю узрытую,
Што крывёй чырвонаю, як дажджом палітая.
Пушчы непраходныя, паплавы зялёныя
Туманы схавалі, туманы ахуталі.
Не відаць ні сцежак, ні дарог аб'езджаных,
Ні палос сялянскіх, бараной паследжаных.
Туманы схавалі, туманы ахуталі
Над усім Барысавым каміны фабрычныя,
Каміны фабрычныя і дамы каменныя,
І дамы каменныя і халупы бедныя.
А па ўсіх па вуліцах горада Барысава
Раз'язджаюць коннікі—ўсё палякі белыя.
Гойсаюць па вуліцах слаўнага Барысава
Ўсё паны вусатыя і падпанкі лысыя.
Ой наш слаўны горад! Па тваіх вакoліцах
Вёскі люду беднага, беднага-гаротнага...
Спалена дашчэнту ўсё агнямі ворага,
А зямля закурана горкім дымам-порахам.
Чутна—плачуць людзі за ракой Бярозаю,
Праклінаюць людзі палякоў-драпежнікаў.
І ляціць іх лямант землямі шырокімі
У збавенны горад, у Маскву радзімую.

***

А ў Маскве радзімай, у Маскве вялікай
У палацы старым жылі два браты,
Што за век свой зналі многа долі горкай,
Бачылі на свеце белым многа беднаты.
Шмат прайшлі пакут яны і няўзгод усякіх,
Катаржнаю працай змучаны былі.
І таму кляліся век увесь змагацца
З ворагамі люду на усёй зямлі.
А як брат старэйшы—гэта родны Ленін,
За народ бядняцкі ён стаяў гарой;
А як брат малодшы—гэта родны Сталін
Не шкадуе люду сілушкі сваёй.
От браты пачулі плач людскі з Бярозы,
Што прынеслі ветры на сваіх крылах.
От яны пазвалі друга дарагога,
Выпраўлялі друга у далёкі шлях.
А іх друг любімы, ваявода смелы,
Не баяўся ворагаў ён нідзе ў баю,
Ён адзін у чоўне цераз Каспій-мора
Пераплыў, як лебедзь, ў бурную пару.
Ваяводу звалі і браты і людзі,
Называлі ўсюды:—баявы Серго!
Ўсе яго любілі, быццам маці сына,
Дарагога, роднага, лепшага свайго.
От Серго пазвалі браты на параду.
Гаварылі шчыра:—Паязджай, арол!
Ў чыста поле—полюшка, на раку Бярозу,
Дзе крывёй працоўнаю пазаліты дол;
Ды збяры дружыну моцную, сталёвую,
З горада і вёсак павыгнаны люд,
Правучы як следуе белапольскіх панаў,
Ды пазбаў Бярозу ад бяды-пакут.
Раніцою золкаю, раніцою яснаю
Выязджаў Серго наш на кані гнядым.
І яго праводзілі, цёпла развіталіся
Два браты вялікія, родныя браты.
Зашуміце, травы і лясы зялёныя!
Выхадзі, Бяроза, з стромкіх берагоў!
Едзе слаўным шляхам на гнядым на коніку
Ваявода смелы, баявы Серго!

***

Ля Бярозы ў лузе крынічка цякла,
Цякла ды студзёная у быстру раку.
А Бярозай вечарам лодачка плыла,
Плыла, плыла вузкая па левым баку.
Як прыстала лодачка каля трох дубоў,
Тады з тае лодачкі чалавек сышоў.
Стаў ён думу думаці каля трох дубоў,
Як прагнаці ворага, як павесці бой.
А можа ён думае пра раку Дунай?
А можа ён думае пра мора Каспій?
Як па моры Каспію ў лодачцы ён плыў
Як за морам-Каспіем ворага ён біў.
Шмат стаяў задумлівы ваявода наш
І глядзеў, як слаўся за ракой туман.
Перадумаў многае на шчаслівы час,
І рашыў разведаць белапольскі стан.

***

От сабраў Серго сям'ю ратную,
Сям'ю ратную, боездольную.
От павёў Серго лесам-пушчаю,
Лесам-пушчаю, сцежкай дольнаю.
От павёў Серго ўсіх на ворага
Ды заядлага белапольскага.
Зашумелі бары векавечныя,
Палянцаў грозны шум адгалоскамі.
І пачулі той шум, той пагрозлівы
Паны лысыя, ляхі белыя;
Задрыжэлі яны, сталі радзіцца,
Задрыжэлі паны ашалелыя.
Ваявода тады крыкнуў:—Сокалы,
Мае родныя! Біце ворага.
Паскакалі тады рыссю конікі,
Паляцелі у бой нашы коннікі.
Медзі град тады як пасыпаўся
На паноў-белякоў, на драпежлівых,
А уланы паны памяшаліся,
Беглі-беглі яны, беглі спешліва.
Пацякла ручаём кроў з іх чорная.
Ўсюды-ўсюды ляжаць паны пухлыя.
А ваякі лятуць, грозну сілу нясуць
Палякам-белякам ды дасужлівым.
А Бяроза-рака прасвятлілася
Адплылі туманы ды халодныя
Праясніўся прастор над Барысавам,
Заблішчэлі палі, вёскі родныя.

***

А Бяроза цячэ, а Бяроза плыве,
А Бяроза плыве ў далеч-дальнюю.
А Барысаў цвіце, вольны горад цвіце
І праводзіць дамоў сына слаўнага.





У хуткім часе Саюздзетфільм выпускае дзіцячы юбілейны фільм «Бялее парус адзінокі» па аповесці В. Катаева. Рэжысёр—В. Лагошын. На здымках (злева направа): Барыс Рунге ў ролі Пеці, артыст А. Чэкаеўскі ў ролі Цярэнція і Ігар Бут у ролі Гаўрыка. Саюзфота.

Праект акадэмічнага кінотэатра

З усіх работ, выкананых архітэктарамі Белдзяржпраекту за апошні час, праект Акадэмічнага кінотэатра, бадай, самы ўдалы. Аўтарам праекту, архітэктарам Вараксіну і Столеру, удалося знайсці для кінотэатра лаканічнае, удалае вырашэнне.

Акадэмічны кінотэатр павінен афарміць адзін з бакоў будучай плошчы Советаў Менска. Вялікія размеры гэтай плошчы, а таксама яе рэльеф, патрабавалі ад аўтараў праекту асаблівай увагі да высотнага вырашэння кінотэатра. Для гэтага галоўныя ўваходы апрацоўваюцца парадней лесвіцай, якая ўздымае падлогу першага паверху на два метры.

Фасад тэатра афармляецца магутнай каланадай, якая падтрымлівае цяжкі, добра прафеліраваны карніз, над якім устаноўлены бетонныя, скульптурныя фігуры. Апошнія ўстаноўлены такім чынам, што калоны з'яўляюцца нібы і іх пастаментамі. Аналагічнае вырашэнне, толькі без скульптур, дадзена і бакавым фасадам, на якія адкрываецца перспектыва з плошчы.

Галоўны ўваход сваімі бакавымі дзвярыма вядзе гледача ў касавы вестыбюль. Купіўшы білет, глядач праз тры сярэднія дзверы праходзіць у галоўны вестыбюль з двухбаковым размяшчэннем гардэробаў. Распрануўшыся, ён па шырокай парадней лесвіцы падымаецца на пляцоўку, адкуль можа прайсці альбо ў глядзельную залу, альбо ў файэ.

Глядзельная зала разлічана на 1200 месц, з якіх 200 размешчаны на балконах і ў бакавых ложах. З мэтай патрэбнай відзімасці экрана з усіх месц куты залы перад экранам зрэзаны, што павышае таксама і акустычныя ўласцівасці залы.

Файэ кінотэатра вырашана адным адкрытым аб'ёмам, з размеркаваннем чакаючых гледачоў на трох узроўнях. Другі ўзровень прыпаднятая над першым і з'яўляецца адкрытай канцэртнай залай на 268 месц.

Для ўнутранага ўпрыгожання тэатра аўтарамі праекту намечана ўжыць звычайную атынкоўку, штучны мармур, каштоўныя пароды дрэва, тканіны, люстры, манументальную і барэльефную скульптуру, кераміку і натуральныя каменныя абліцовачныя матэрыялы. *А. ДАЛІН.*

Дзяржаўнае выдавецтва выбаршчыкам

У дапамогу выбаршчыкам Дзяржвыдавецтва Беларусі ў сучасны момант друкуе наступныя брашуры: Самойлаў—«Як адбываліся выбары пры царызме», Вольскі—«Як адбываюцца выбары ў буржуазных краінах», Вышынскі—«Напярэдадні выбараў» і «Палітычна-эканамічныя асновы СССР» Брашуры выйдуць тыражом у 20 тыс. экз. кожная.

Аматарскія вітрыны

Лепшым паказальнікам поспеху ўсебеларускай выстаўкі з'яўляюцца кнігі запісаў уражанняў наведвальнікаў. Колькі добрых водгукаў і правільных заўваг можна знайсці ў гэтых кнігах! У аддзеле, які прадстаўляе жывапіс, тэатры і кіно, таксама ёсць такая кніга. У ёй чамусьці запісаў мала. Амаль усе яны датычацца выдатных карцін мастака Пэна. Пра тэатр і кіно няма нічога, за выключэннем аднаго запісу: «Выстаўка тэатраў арганізавана дрэнна». Да гэтага лаканічнага радка, па сутнасці, няма чаго дадаць. Яна сапраўды арганізавана дрэнна. Павільён выстаўкі тэатраў нагадвае сабою аматарскую вітрыну, якая аформлена няўмелай, лянівай рукой. Беларускі драматычны тэатр прадстаўлены дзесяткам фота з розных пастановак. Усе яны развешаны як папала. Прычым, цікавая дэталь: ні адно фота не мае сваёй назвы. Да якой пастаноўкі яно датычыцца, што ўяўляе сабою паказваемая сцэна, якія акторы сфатаграфаваны ў ёй—нічога невядома. Відаць, тут разлічвалі на памяць гледача, які глядзеў калісьці гэтыя пастаноўкі.

А беларускі драматычны тэатр меў добрыя магчымасці зрабіць сваю выстаўку цікавай і змястоўнай. За 17 гадоў яго работы накапілася многа цікавых дакументальных матэрыялаў з якіх на выстаўку трапіла толькі маленькая афіша, якая паведамляе аб адкрыцці беларускага тэатра ў 1920 годзе. Тэатр стварыў рад выдатных мастацкіх вобразаў. Можна было зрабіць цэлую фотагалерэю вядучых вобразаў лепшых пастановак, таксама як і актораў, якія стварылі гэтыя вобразы. Фотаматэрыял з пастановак неабходна і трэба было размясціць па тэматычнаму прынцыпу, чаго на выстаўцы няма. Храналогіі таксама ніякай.

Зусім не адлюстраван на выстаўцы рост наведвання тэатра і наогул сувязь з гледачом. Наведвальнік з выстаўкі не можа даведацца, наколькі любіць глядач беларускі драматычны тэатр. А тут таксама можна было даць рад цікавых матэрыялаў. Усё гэта поўнасцю можна аднесці і да астатніх тэатраў (рускі драматычны, віцебскі гарадскі, яўрэйскі тэатр), з тою толькі розніцай, што ўсе гэтыя тэатры і таго менш далі. А яўрэйскі тэатр абмежаваўся толькі адным аляпаватым макетам з нейкай пастаноўкі.

Параўнаўча лепш аформлена выстаўка Тэатра оперы і балета. Тут кожнае фота мае свой адрас і ўведзена ў комплекс фотаматэрыялу той ці іншай пастаноўкі. Фотаматэрыялы паказаны красачнымі замалёўкамі дэкарацый пастановак. Тут нават не здагадаліся даць мастацка-архітэктурны праект альбо макет новага тэатра оперы і балета.

У цэлым выстаўка тэатраў нездавальняючая. З гэтай выстаўкі наведвальнік не пакіне ў сябе пэўнага ўяўлення пра рост і дасягненні тэатраў БССР.

У гэтых адносінах павільён Белдзяржкіно крыху адрозніваецца. Тут досыць багата прадстаўлены і добра размешчаны фотакадры з беларускіх карцін. Ёсць фотагалерэя асноўнага складу творчых работнікаў кіностудыі.

Дыяграмы даюць уяўленне аб выпуску карцін па годах, аб наведванні кінотэатраў. Не шкодзіла-б даць яшчэ спісак выпушчаных карцін Белдзяржкіно з кароткай анатацыяй кожнай карціны. Вельмі дрэнна, што павільён Белдзяржкіно размешчаны ў цёмным прахадным карыдоры, што вельмі перашкаджае азнаямленню з матэрыяламі.

К. ГУБАРЭВІЧ.

Новая плошча ў Менску

На месцы былога Траецкага базару, згодна генеральнаму плану рэканструкцыі Менска, ствараецца новая плошча імя Парыжскай Комуны. Базарныя крамкі даўно ўжо знесены. На іх месцы зараз узвышаецца вялізная пабудова ў асноўным ужо скончанага будаўніцтвам Вялікага Беларускага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета. Праект плошчы выкананы маладымі архітэктарамі горсовета Мураўёвым і Батоевай.

Як будзе выглядаць новая плошча? З трох бакоў яна будзе забудавана 4—5-павярховымі будынкамі, а чацвертая—у бок ракі Свіслач—запраектаваны паркавы. Плошча перад тэатрам запраектавана поўкругам, з пастаноўкай на ёй групавой скульптуры, якая як па замыслу, так і па прапорцыях павінна быць звязана са скульптурамі тэатра. Па баках плошча перад тэатрам афармляецца роўнай зелянінай.

Ад галоўнага ўваходу ў тэатр у бок ракі Свіслач запраектавана алея, якая ідзе паміж газонамі зелені і кустарнікавымі насаджэннямі. Спуск гэтай алеі да ракі Свіслач афармляецца лесвіцамі і скульптурамі. На цэнтральнай плошчы [illegible]ага спуску запраектаваны фантаны.

Асноўныя магістралі дыяметрычна правільныя. З мэтай лепшай разгрузкі плошчы на бакавых 40-метравых магістралях намечаны трамвайныя лініі, адна з якіх ужо існуе. З існуючым цэнтрам горада як плошча, так і парк звязваюцца трамвайнай лініяй і праезнымі і пешымі мастамі.

Праект гэтай плошчы зроблены яшчэ ўлетку, але, нажаль, ён яшчэ да гэтага часу Саюзам архітэктараў не абмяркоўваўся. А абмеркаванне і магчымыя папраўкі да гэтага праекту маладых аўтараў тым больш неабходны, што сама плошча, у сувязі з пабудовай тэатра, ужо ствараецца.

А. Д.

„Як гартавалася сталь“

Да XX гадавіны Вялікай соцыялістычнай рэволюцыі беларускія тэатры паказалі тры спектаклі, прысвечаныя тэме народнага гераізма—«У пушчах Палесся» Я. Коласа, «Салавей» З. Бядулі і «Як гартавалася сталь» па раману Н. Астроўскага, у інсцэніроўцы М. Юдэлевіча і Е. Раймонд.

Іх ідэалагічная накіраванасць аднолькавая—паказ барацьбы працоўнага народа за вызваленне чалавецтва з-пад ярма эксплаатацыі.

Недахопам інсцэніроўкі з'яўляецца яе шматэпізадычнасць і адсутнасць сюжэту. Рэжысёры Дзяржаўнага дзіцячага тэатра БССР (Е. Міровіч і Ю. Палічынецкі) шмат чаго недаробілі ў сваёй пастаноўцы. Два стылі—бытавы і рамантычна-гераічны ўвесь час прысутнічаюць на спектаклі і перашкаджаюць адзін другому. Гэта толькі блытае гледача і ён не разумее, дзе і калі адбываецца дзея. Трэцяя сцэна—у турме—так, як яна ідзе зараз,—лішняя. Фінал яе зроблен толькі для таго, каб выклікаць смех у гледача. І неяк не вяжацца з планам спектакля прысутнасць такіх персанажаў, як самагоншчыца і палкоўнік Чарняк, камендант і цырульнік Зельцэр, якія зроблены ў плане шаржа.

Масавыя сцэны—камсамольскі сход, на будаўніцтве—пастаноўшчыкамі не распрацаваны.

Перад рэжысёрамі стаяла задача стварэння рамантычна гераічнага спектакля, гучанне якога адпавядала-б гучанню твора. Гэта не ўдалося. Асноўны недахоп амаль усіх актораў: беднасць інтанацый, дэкламацыйнасць, ілюзорны пафас, неапраўданасць рухаў, адсутнасць мастацкай дэталі ў вобразе, кампазіцыйная неахайнасць у стварэнні яго і шмат іншага.

Аб адным з асноўных і любімых герояў свайго рамана Астроўскі так пісаў: «...Жалезная фігура Жухрая,



Фінал п'есы «Як гартавалася сталь». Актор Фрыдман у ролі Карчагіна, акторка Заборская ў ролі маці. Фота Л. Сашына.

халоднаспакойная, і голас цвёрды, які не дапускае пярэчанняў». (стар. 167). Чалавек загартаванай волі, вялікага арганізатарскага таленту, першы настаўнік Паўкі—багаты чалавечы вобраз. В. Чэмелаў не знайшоў амаль ні адной праўдзівай рысы жывога Жухрая. Ёнператварыў гэтага цудоўнага чалавека ў схему, якая гучна гаворыць і нязграбна рухаецца. А гэты вобраз бальшэвіка глядач павінен любіць.

Рыта Усціновіч (Ю. Гальперына) у пачатку спектакля павінна быць «васемнаццацігадовай дзяўчынкай», але, на вялікі жаль, яна ўвесь час аднолькавая—пазбаўленая юнацкай абаяльнасці. Яе можна параўнаць з такім-жа няўдалым вобразам Арцёма (Л. Буцько).

Нічым не адрозніваецца ад папярэдніх вобразаў спектакля Жаркі (Н. Міхайлаў). Ён шмат крычыць, хвалюецца, некага заклікае, але глядач усяму гэтаму не верыць. Актор не распрацаваў вобраза.

Нават вясёлы Панкратаў (В. Стэльмах) зусім непрыкметна з'яўляецца на сцэне і таксама непрыкметна знікае, а каб яго і зусім не было ў спектаклі, дык спектакль нічога-б не страціў. Гэта не жартаўнік, якога любілі і паважалі камсамольцы, а балагур.

Вобраз прафесара (П. Мефедаў)—зусім бездапаможны. Ён вымярае сцэну крокамі з канца ў канец, часам робіць нясмелыя жэсты, бяссэнсна крычыць. Карысці ад гэтага аніякай.

Мала працавалі пастаноўшчыкі з акторамі.

Частка актораў зняважліва і неахайна аднеслася да эпізадычных роляў, не разумеючы, што поспех кожнай ролі залежыць не ад памеру тэксту, а ад якасці выканання.

М. Фрадкін выконваў дзве ролькі—інжынера і польскага паручыка. Абодва персанажы зроблены надзвычай прымітыўна. Гэта толькі некаторыя накіды да вобразаў.

Віктар Ляшчынскі ў выкананні А. Дашкоўскага—няўдалы персанаж, схематычны. Такая трактоўка вобраза ворага прыніжае ўспрыняцце яго гледачом.

Выключна на знадворных якасцях пабудаваў ролю каменданта акт. Б. Левін.

Афармленне (мастак П. Кіпніс) не выразнае, не арганічнае, а ў некаторых карцінах (першы акт) нават грамоздкае.

Музыка (кампазітар П. Падкавыраў), таксама ні чым не дапамагае спектаклю.

Вось асноўныя памылкі, якія дапусціў калектыў Дзяржаўнага дзіцячага тэатра ў спектаклі «Як гартавалася сталь».

Аднак, глядач пакідае залу з задавальненнем—любімы твор пісьменніка-бальшэвіка Астроўскага ў асноўным знайшоў нядрэннае сцэнічнае ўвасабленне. Тэатр зразумеў пісьменніка, ні на крок не адступіў ад рамана.

Паўка Карчагін (Л. Фрыдман)—надзвычай цікавы і шматгранны вобраз. Актор іграе, па сутнасці, дзве ролі—юнака і цалкам ужо сфармаванага чалавека. Прычым першую частку ролі ён іграе слабей, чым другую. Залішняя наіўнасць, нерэальная гарачнасць, адсутнасць дзіцячай непасрэднасці—вось недахопы юнацкага перыяду вобраза Паўкі Карчагіна. Іншая справа, калі Павел вырас і стаў у рады змагароў. Гэта сапраўды мужны і адданы сын сваёй радзімы. Не шкадуючы сіл і жыцця, ён усяго сябе аддае рэвалюцыі. Чалавек выключнай волі і вынослівасці, Паўка Карчагін з'яўляецца яркім прадстаўніком свайго пакалення. Актору ўдалася гэтая частка ролі таму, што тут у яго ігры больш праўдзівасці.

Цікава зроблены вобразы Паўкіных сяброў: Сярожы (В. Сівіцкі), Валі (С. Гурвіч) і Клімкі (П. Бандараў). Яны ўсе абаяльны і па-дзіцячаму непасрэдны.

Радуе маці Карчагіна. Актрыса М. Заборская стварыла яркі вобраз клапатлівай маці—з лірычнай ласкавасцю і жаночай цеплынёй.

Нельга абыйсці Тоні Туманавай. Актрыса З. Браварская стварыла цікавы вобраз, які заслугоўвае ўвагі. Але, на вялікі жаль, гэты вобраз таксама іграецца ў двух планах—дзяўчынкі і сталай жанчыны. Стварэнню наіўнай і вясёлай дзяўчынкі значна дапамог тэкст і сітуацыя, у якую быў пастаўлены вобраз Тосі. У далейшым-жа гэты вобраз ідзе на зніжэнне. А між тым у п'есе ёсць мясціны, дзе актрыса магла-б закончыць гэты вобраз (пятая і восьмая карціны), але яна пасіўная да сваёй ролі, далейшы лёс гэтага персанажа яе не цікавіць. Здольная актрыса бліснула некалькімі фарбамі ў спектаклі і тут-жа іх згубіла, з прычыны сваёй нявопытнасці.

Поспех спектакля забяспечвае тое, што рад карцін—другая, чацвертая, сёмая, адзінаццатая і чатырнаццатая—зроблены добра. У іх захоўваецца аснова стылю рамантычна-гераічнага спектакля.

Спектакль «Як гартавалася сталь» Дзяржаўнага дзіцячага тэатра з'яўляецца цікавай работай, не гледзячы на рад істотных памылак, што паказаны намі вышэй.

Глядач задаволены спектаклем. Ён рад, што ўбачыў юнага героя, які мужна змагаўся за шчасце ўсяго чалавецтва—за соцыялізм. *А. Е.*

Падрыхтоўка чырвонаармейскай самадзейнасці да XX-годдзя РСЧА

З новым папаўненнем, якое ўлілося ў рады Чырвонай Арміі, чырвонаармейская мастацкая самадзейнасць таксама папоўнілася маладымі кадрамі самадзейных артыстаў, музыкантаў, спевакоў, зацейнікаў. Сярод моладзі, што прыбыла ў часці, многа здольных і таленавітых самадзейнікаў. У часцях вырастаюць новыя калектывы, папаўняюцца існуючыя. Мастацкая самадзейнасць рыхтуецца да вартай сустрэчы слаўнай XX гадавіны гераічнай і непераможнай Чырвонай Арміі.

Хоры, вакальныя ансамблі, самадзейныя аркестры, ансамблі чырвонаармейскіх і народных песень развучваюць новы савецкі рэпертуар. Спевакі і чытальнікі рыхтуюць рэпертуар пра герою Чырвонай Арміі. Карыстаючыйся у менскім гарнізоне вядомасцю, ансамбль чырвонаармейскай песні і пляскі, якім кіруе т. Маркін, рыхтуе «Сказ о ледовом походе»—новая работа прафесара Аляксандрава. Ансамбль артылерыстаў-частушачнікаў, кіруемы т. Эўштэйнам, узмацняецца аркестровым складам, чытальнікамі і хорам. Створан змешаны масавы хор кавалерыстаў у складзе 250 чалавек. Танцавальныя калектывы, кіруемыя жонкай камандзіра Гросберг, прыступаюць да падрыхтоўкі чырвонаармейскага масавага танца. Неабвядомы аркестр гарманістаў (кіраўнік т. Матухненка) да XX гадавіны ўкамплектоўваецца музыкантамі да 150 чалавек. Да аркестра дадаецца жаночы вакальны ансамбль і калектыў кавалерыйскіх танцаў. Восенскія прагляды самадзейнасці паказалі вялікі рост за год актыўнасці і палепшанне якасці чырвонаармейскай самадзейнасці. Актыўнасць узмацняецца. Да XX сваёй гадавіны Чырвоная Армія безумоўна пакажа добрыя ўзоры свайго самадзейнага мастацтва.

В. ГЛ.

Пісьменнікі ў Лепелі

Гэтымі днямі брыгада пісьменнікаў у складзе тт. Шапавалава, Броўкі і Самуйлёнка выехала ў г. Лепель.

Тав. Шапавалаў зрабіў на канферэнцыі настаўнікаў Лепельскага раёна даклад на тэму «20 год беларускай савецкай літаратуры». Пасля даклада пісьменнікі прачыталі свае вершы і апавяданні. Прысутныя на канферэнцыі вельмі цёпла сустрэлі пісьменнікаў.

На другім сходзе, у вайсковай часці пісьменнікі тт. Шапавалаў, Броўка і Самуйлёнак выступілі з сваімі творамі. Камандаванне вынесла тт. Шапавалаву, Броўку і Самуйлёнку падзяку.

Брыгада пісьменнікаў таксама выязджала ў Стойскі сельсовет Лепельскага раёна. Тав. Шапавалаў у школе зрабіў даклад для калгаснікаў «Аб міжнародным становішчы і задачах выбарчай кампаніі».

На імя праўлення Саюза савецкіх пісьменнікаў ад Культпропа акругкома КП(б)Б атрыманы ліст, у якім просяць, каб Праўленне ССПБ накіравала ў Лепель пісьменнікаў для правядзення творчых вечароў, прысвечаных Сталінскай Канстытуцыі і выбарам у Вярхоўны Совет Саюза ССР.

С. КРЫВІЦА.

Адказны рэдактар І. ГУРСКІ.

Вучні Беларускай Дзяржаўнай кансерваторыі па класу настаўніцы Сямашка з жалем паведамляюць аб смерці любімай і паважаемай

ВАЛЕНЦІНЫ АНТОНАЎНЫ

і выказваюць спачуванне яе сыну Міхаілу Мар'янавічу

СЯМАШКА

Друкарня імя Сталіна. Газета «Літаратура і Мастацтва» выходзіць раз у пяцідзёнку. Адрас рэдакцыі: Менск, Совецкая, 68, Дом пісьменніка. Тэлефон № 25394. Уп. Галоўлітбела № 3308.